*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

**13** ВЕРАСНЯ 2008 г. СУБОТА № 173 (26286)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Мы едзем!

## «ПАДПІСКА — ГЭТА СВЯТОЕ!»

...Знаёмы (па анекдотах) пажарнік, калі помніце, на работу сваю не скардзіўся. Адно, казаў, як пажар, — хоць звальняйся.

Вось і нам — як падпіска... Бо, апроч іншага, трэба ж усе прызы паўручаць...

Перш чым са сцен рэдакцыі вынесці і вывезці самы галоўны (а ўжо цяжкі!) — дзвюхкамерны халадзільнік «Атлант» — патэлефанавалі падпісчыцы, якая выйграла яго, спыталі, ці патрэбны?

— Яшчэ і як! — усклікнула Людміла Дзмітрыеўна Бондар з Рэчыцы. — Я ўжо зачакалася! На свой стары цяпер і глядзець не хачу! Нейкі цесны ён стаў, непрыгожы... Ведама — трэці дзесятак. А новы — з пенсіі ды з малымі ўнукамі — не вельмі купіш.

— Дык, мо, — пажартавалі, — эканоміць трэба было — на падпісцы?

— Не! — падпіска, а тым больш на «Звязду» — гэта для мяне святое! — заявіла Людміла Дзмітрыеўна...

Заканамернае тут «чаму?» (ды і безліч іншых пытанняў) мы плануем задаць ёй непасрэдна, падчас сустрэчы. Адбудзецца яна ў аўторак, 16 верасня ў 16 гадзін у актавай зале Рэчыцкага райвыканкама.

Назаўтра — 17 верасня ў 14 гадзін Дзень падпісчыка «Звязды» з уручэннем тэлевізара «Віцязь» Антону Іванавічу Сасноўскаму, з узаемнымі знаёмствамі, расказамі пра газету, вершамі, байкамі, віктарынамі пройдзе ў актавай зале Лельчыцкага райвыканкама. Калі ласка — прыходзьце!

І, зразумела ж, не забудзьцеся падпісацца на сваю родную газету на роднай мове, даслаць картку на розыгрыш прызоў. Ён, чарговы, адбудзецца, як вядома, у першыя дні кастрычніка, і назаве прозвішчы новых шчаслiўчыкаў.

Цалкам магчыма — у тым ліку — і ваша!

**Валянціна ДОЎНАР, Уладзімір ЗДАНОВІЧ, Яўген ПЯСЕЦКІ.**

## Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў з 2009 года выводзіць кінавідэагаліну Беларусі на самаакупнасць

**Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі, наведваючы шматзальны кінатэатр «Беларусь» у Мінску.**

«Пакуль не будзеце ўкладвацца, нічога не будзе. Бярыце крэдыты, здымайце фільмы. Здымеце добры фільм — мы гэта кампенсуем. Наперад жа грошы не атрымаеце», — сказаў кіраўнік дзяржавы. «Едзьце ў Галівуд, вазьміце іх сістэму работы. Яны ж дзень і ноч працуюць! У Расіі нагогул горш за нас пачыналі. Ім што, Прэзідэнт дапамог? Яны шукаюць грошы і здымаюць кіно», — падкрэсліў ён. Прэзідэнт таксама выказаў незадавальненне развіццём беларускага кінематографа: «15 гадоў таму мною былі пастаўлены задачы па развіцці кінематографа. 15 гадоў мінула, а дзе вынік?».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў і наяўнасць праблем з кадрамі ў кінематаграфіі. Сярэдні ўзрост рэжысёраў сёння каля 60 гадоў. Кіраўнік дзяржавы лічыць, што да вытворчасці кінавідэапрадукцыі неабходна прыцягваць маладых перспектыўных людзей. «Збярыце тых, хто хоча па-сапраўднаму працаваць. А я заўсёды падтрымаю маладыя таленты», — запэўніў ён.

«Наперад, пад добрае слова, даваць грошы не будзем, — сказаў Прэзідэнт. — Я вас падтрымліваў, аддачы ж пакуль няма. Будзеце працаваць, выдаваць добры прадукт — будуць і грошы. Стварайце добрыя фільмы, а мы ў вас іх купім».

«Добрыя рэжысёры і акцёры, можаце быць упэўнены, будуць і багатымі і знакамітымі», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Аляксандр Лукашэнка даручыў завяршыць рэканструкцыю кінастудыі «Беларусьфільм» да 1 мая 2010 года. У час наведвання кінатэатра былі абмеркаваны ўсе праблемы беларускага кінематографа. Як было даложана Прэзідэнту, у 2009 годзе плануецца завяршыць рамонт усіх кінатэатраў у рэспубліцы. Каля палавіны кінатэатраў у 2009—2010 гадах будуць аснашчаны сістэмай «Долбі-стэрэа». Набыты відэапраекцыйныя комплексы і аўтамабілі, якія даюць магчымасць паказваць кінафільмы ў аддаленых населеных пунктах сельскай мясцовасці. З кожным годам павялічваецца колькасць закупляемых стужак для дэманстрацыі ў кінатэатрах, у тым ліку для моладзі і дзяцей.

У той жа час застаецца вельмі нізкі працэнт дэманструемых фільмаў беларускай вытворчасці. Так, у кінатэатрах краіны паказваюць 36 працэнтаў фільмаў вытворчасці ЗША, 30 працэнтаў — расійскіх, 24 працэнты — еўрапейскія і толькі 5 працэнтаў вытворчасці кінастудыі «Беларусьфільм». Паводле слоў генеральнага дырэктара кінастудыі Уладзіміра Замяталіна, цяпер на кінастудыі немагчыма забяспечыць поўны цыкл кінавытворчасці, таму неабходна ездзіць у Маскву. Паводле яго слоў, пасля завяршэння рэканструкцыі і мадэрнізацыі кінастудыі гэта задача будзе вырашана.

Як падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, неабходна ўдзяляць больш увагі прапагандзе і папулярызацыі беларускага кіно, і анімацыі ў прыватнасці. Прэзідэнт чарговы раз нагадаў, што неабходна дбайна расходаваць фінансавыя сродкі. «Не размахвайцеся, лічыце грошы. Калі б я быў упэўнены, што вы здымеце фільм, які будзе грымець у свеце, то я б вам даў вялікія сродкі», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Аднак «тыя, хто бярэ грошы проста так, добра працаваць не будуць: патрэбна жорсткая канкурэнцыя і імкненне штосьці атрымаць», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

**Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## МЫ КАЖАМ НАШАЙ СТАЛІЦЫ — ТАК ТРЫМАЦЬ!

А на мой погляд...

**Сёння сталіца адзначае свята горада, гэткі своеасаблівы дзень нараджэння. А перад ім прынята наводзіць чысціню, парадак. І Мінск у гэтым плане рыхтуецца да свята, можна сказаць, увесь год.**

**З якім настроем вы сустракаеце гэты дзень, чым парадавала вас сталіца за апошні час у плане добраўпарадкавання, чаго вы яшчэ чакаеце?**

***Максім СТРЫГЕЛЬСКІ, намеснік дырэктара ПУП «Таксастыль»:***

— Горад радуе сваёй дагледжанасцю і чысцінёй. Пажаданне тут толькі адно — каб так было і надалей. Асабіста мяне вельмі парадавала ў апошні час тое, як была добраўпарадкавана дзіцячая пляцоўка побач з домам. Увогуле, усе прыдваровыя тэрыторыі па месцы майго жыхарства цяпер выглядаюць вельмі добра.

Прапанова ж у мяне толькі ў дачыненні сквераў, зялёных зонаў. Яны, на жаль, не заўсёды бываюць дагледжанымі. Хоць нядаўна, гуляючы з дзіцем, я быў прыемна здзіўлены, калі ўбачыў у скверы міліцыянераў на скутэрах. Іх з'яўленне дысцыплінуе некаторых грамадзян, перашкаджае ім раскідваць смецце, распіваць алкагольныя напоі.

***Валянціна САЗОНАВА, начальнік аддзела рэгістрацыі, ліквідацыі суб'ектаў гаспадарання Мінаблвыканкама:***

— Мне ўсё падабаецца, усё задавальняе. Я жыву ў мікрараёне «Сухарава». Гэта раён навабудоўляў, там кожны дзень адкрываецца нешта новае — або магазін, або новая дарожка *(смяецца).* І горад наш у цэлым вельмі добры!

***Аляксандр КАЛІНОЎСКІ, начальнік упраўлення прадпрымальніцтва Мінгарвыканкама:***

— Свята — гэта заўсёды добра, свята — заўсёды песня *(смяецца).*

***(Заканчэнне на 4-й стар.)***

З першых вуснаў

## Гістарычны цэнтр да свята гатовы!

**Менавіта адсюль, з гістарычнага цэнтра, пачынаецца летапіс горада на Нямізе. Гэта сэрца сучаснага Мінска, дзе, насуперак бязлітаснаму часу і шматлікім войнам, захавалася багата культурных і гістарычных помнікаў. Самабытнасць архітэктуры, вялікая колькасць маляўнічых краявідаў і ўтульных куточкаў, сама атмасфера ажыўшай гісторыі зрабілі стары Мінск вельмі папулярным месцам не толькі ў сталічных жыхароў, але і ў іх гасцей.**

**У гістарычным цэнтры Мінска на любое свята ладзіцца шмат забаўляльных і культурных мерапрыемстваў. Не стане выключэннем і Дзень горада. Пра тое, якія работы па падрыхтоўцы да свята былі праведзены ў гістарычным цэнтры, нам расказаў дырэктар камунальнага будаўніча-эксплуатацыйнага ўнітарнага прадпрыемства «Мінская спадчына» Павел ШЫКУНЕЦ:**

— Нагадаю, што гістарычным цэнтрам нашай сталіцы лічыцца тэрыторыя ў межах Траецкага прадмесця, Верхняга горада, вуліц Інтэрнацыянальная, Гандлёвая, Няміга, плошчы Свабоды, Ракаўскага прадмесця і Мінскага замчышча.

«Мінская спадчына» — шмапрофільная арганізацыя, аднак наша асноўная функцыя — рэканструкцыя і рэстаўрацыя аб'ектаў гістарычнага цэнтра (мы з'яўляемся галоўным заказчыкам), а таксама кантроль за выкананнем патрабаванняў адпаведнай комплекснай праграмы аднаўлення старога Мінска, зацверджанай урадам чатыры гады таму.

***(Заканчэнне на 4-й стар.)***

## Як яму спалася? Спакойна ці не?

Цяжка сказаць, як гэта было раней, калі кіраўнік аднаго з прыватных прадпрыемстваў Лельчыц недаплачваў падаткі і зборы ад атрыманай выручкі. А што цяпер, калі ў дачыненні да яго ўзбуджана крымінальная справа за недаплату 784 мільёнаў рублёў на працягу трох гадоў у бюджэт, яму не да сну — гэта факт.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

## Хто пакрыўдзіў выратавальнікаў?

За мінулы купальны сезон супрацоўнікі Гомельскага абласнога таварыства ратавання на водах выратавалі не аднаго чалавека, па сутнасці, падараваўшы многім другое жыццё. І тут на табе: нехта ноччу раскурочыў кантэйнер, які знаходзіўся на беразе Сожа і ў якім захоўваўся лодачны матор японскай вытворчасці «Хонда» коштам ледзь не ў 29 мільёнаў рублёў, і ўкраў яго.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

## Сябе паказаць замежным інвестарам

**У Брэсце праходзіць Першы інвестыцыйны форум. Паглядзець, ацаніць своеасаблівую прэзентацыю эканамічнага патэнцыялу вобласці прыехалі магчымыя інвестары з 16 краін свету. Прадстаўнікі дзелавых колаў Вялікабрытаніі, Кітая, Балгарыі, Венгрыі, Чэхіі, Італіі і іншых краін бяруць удзел у брэсцкіх агледзінах.**

Для іх арганізавалі спецыяльную выставу-прэзентацыю ў спарткомплексе «Вікторыя». Сфармулявана каля 120 інвестыцыйных прапаноў, якія ў мініяцюрным варыянце прадстаўлены таксама ў каталогу. Для зручнасці гэтыя прапановы скампанаваныя па галінах: прамысловасць, сельская гаспадарка, будаўніцтва, энергетыка, турызм. Асобным раздзелам ідзе свабодная эканамічная зона «Брэст». СЭЗ прэзентуе, напрыклад, праекты арганізацыі вытворчасцяў медыцынскіх прыбораў і абсталявання, парфумы, электронікі для аўтамабіляў. Свае інвестыцыйныя прапановы прывезлі таксама ўсе рэгіёны вобласці. Пружанскі камбінат будаўнічых матэрыялаў хацеў бы прыцягнуць замежны капітал для будаўніцтва новага цагельнага завода. Драгічынскае прадпрыемства «Экзон-Глюкоза» прапануе стварыць сумеснае прадпрыемства па вытворчасці рапсавага алею.

Прадставілі свае праекты і буйныя прадпрыемствы Брэста: электрамеханічны і лямпавы заводы, мэблевая фабрыка. Брэсцкі гарвыканкам шукае дзелавых партнёраў для ўзвядзення турыстычнага аўтакемпінга.

У праграме форуму — правядзенне аўкцыёну па продажы дзяржмаёмасці. Пакупнікам прапануюць пустыя будынкі і зямельныя ўчасткі.

**Яна СВЕТАВА.**

## Аляксандр Лукашэнка павіншаваў работнікаў БелАЗа з 60-годдзем з дня заснавання

«Сёння Беларускі аўтамабільны завод — гордасць айчыннага машынабудавання. Тут распрацавана больш як 500 мадыфікацый тэхнікі па абслугоўванні дарожна-будаўнічых і гарнатранспартных работ. У 70 краінах свету БелАЗы заваявалі рэпутацыю надзейных аўтамабіляў у самых суровых умовах эксплуатацыі. Прадпрыемству належыць больш як 30 працэнтаў сусветнага рынку кар'ерных самазвалаў», — адзначаецца ў віншаванні. «Перакананы, што эфектыўнае выкарыстанне вамі існуючага патэнцыялу, набытага вопыту і сучасных тэхналогій будзе і ў далейшым садзейнічаць нарошчванню вытворчасці канкурэнтаздольных аўтагігантаў, пашырэнню ўзаемавыгадных сувязяў з партнёрамі з блізкага і далёкага замежжа, умацаванню становішча нашай краіны на міжнароднай арэне», — падкрэсліў Прэзідэнт.

**БЕЛТА.**

## Тарыфная стаўка першага разраду павысіцца ў Беларусі да Br91 тыс. з 1 кастрычніка

Тарыфная стаўка першага разраду для аплаты працы работнікаў арганізацый, якія фінансуюцца з бюджэту і карыстаюцца дзяржаўнымі датацыямі, з 1 кастрычніка 2008 года павысіцца да Br91 тыс. Адпаведны пакет дакументаў унесены ва ўрад на разгляд. Аб гэтым у Гомелі паведаміў, адказваючы на пытанне карэспандэнта БЕЛТА, міністр працы і сацыяльнай абароны Беларусі Уладзімір Патупчык.

11—12 верасня Уладзімір Патупчык, старшыні абласных камітэтаў па працы, занятасці і сацабароне, аблвыканкамаў і Мінгарвыканкама, спецыялісты міністэрства азнаёміліся з работай стацыянарных устаноў сацабслугоўвання насельніцтва Гомельскай вобласці.

Павышэнне тарыфнай стаўкі дасць магчымасць павялічыць сярэднюю заработную плату ў бюджэтнай сферы прыблізна на 21 працэнт. Нагадаем, што ў Беларусі ў красавіку гэтага года тарыфная стаўка першага разраду была павышана амаль на 4,3 працэнта і складае цяпер Br73 тыс.

Выбары -2008

# ХОД КАНЁМ

***У Цэнтрвыбаркаме пайшлі насустрач прапановам місіі АБСЕ і далі магчымасць кандыдатам звярнуцца да электарата зноў — іх выступленні ў эфіры будуць паўтораны***

**Пасля ўсіх перыпетый, калі адны здымалі свае кандыдатуры, а іншыя праз суд змагаліся за сваё права быць зарэгістраванымі, удзельнікаў перадвыбарнай парламенцкай гонкі стала 279. Добраахвотна «сышлі з дыстанцыі», падаўшы адпаведныя заявы, дзевяць чалавек. Як паведаміла на сустрэчы з журналістамі старшыня ЦВК Лідзія Ярмошына, сярод іх былі і трое прадстаўнікоў палітычных партый АГП і БНФ з Гомеля, якія заявілі аб сваім сыходзе ў знак пратэсту. Адмовіліся ад удзелу ў выбарах і чацвёра дзеючых дэпутатаў.**

**ПАРТРЭТ КАНДЫДАТА**

Хто ж яны — тыя, што засталіся ў страі? Іх узрост— у сярэднім 46 гадоў, хоць пры гэтым двум дзесяткам патэнцыйных дэпутатаў не споўнілася яшчэ і 30. Не ўсе кандыдаты скончылі ВНУ (у 22 прэтэндэнтаў ёсць толькі атэстат аб сярэдняй адукацыі). Што да гендэрнага балансу, то прадстаўніц прыгожай паловы — 60. Найбольш часта сустракаюцца сярод кандыдатаў прадпрымальнікі, работнікі медыцынскай, адукацыйнай, праваахоўнай сфер. Хапае ў складзе прэтэндэнтаў і дзеючых дэпутатаў (34 чалавекі), а таксама дзяржслужачых (30). 89 кандыдатаў (а гэта прыкладна трэць) — партыйцы. «У тым ліку 63 чалавекі — ад партый, якія называюць сябе апазіцыйнымі», — падкрэсліла старшыня Цэнтрвыбаркама. Як бачым, пераважная большасць.

> Самы высокі конкурс сярод кандыдатаў чакаецца ў сталіцы і Магілёўскай вобласці — у сярэднім па тры і больш удзельнікі выбараў.
> Там, між іншым, няма ніводнай безальтэрнатыўнай акругі (дзе балатуецца толькі адна асоба).

— На першым месцы па актыўнасці і па прадстаўнічасці знаходзіцца АГП, — праінфармавала Лідзія Ярмошына. — Затым БНФ, і трэцяе месца дзеляць дзве камуністычныя партыі — ПКБ і КПБ.

**УСЁВІДУШЧАЕ ВОКА**

Паводле апошніх даных, для назірання за парламенцкімі выбарамі ў Беларусі акрэдытавана 205 назіральнікаў з 27 краін свету. Як заначыла Л. Ярмошына, яны прадстаўляюць пяць міжнародных арганізацый — Выканкам СНД, Парламенцкі сход Саюза Беларусі і Расіі, Міжпарламенцкую асамблею СНД, Міжпарламенцкую асамблею ЕўрАзЭС , Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека АБСЕ. Яна таксама дадала, што ў ЦВК разглядаюцца яшчэ 522 заявы аб акрэдытацыі назіральнікаў.

— Акрамя таго, адгукнуліся амаль усе Цэнтрвыбаркамы, — заўважыла Л. Ярмошына. — Пакуль маўчаць прыбалты, аднак мы валодаем інфармацыяй аб тым, што нашы латвійскія калегі прапрацоўваюць склад дэлегацыі. Відавочна, не будуць накіроўваць назіральнікаў ЦВК Малдовы і Туркменіі.

Больш як шэсць сотняў нацыянальных назіральнікаў на сёння акрэдытавана ў выбаркамах розных узроўняў. Пераважна ў акруговых камісіях, паколькі актыўна працуюць пакуль толькі яны (а не ўчастковыя).

— Актыўна назіраюць такія палітычныя партыі, як ПКБ, АГП, Грамада, БНФ, — падкрэсліла старшыня Цэнтральнай камісіі.

**СТЭРЭАТЫПЫ? РАЗБУРЫЦЬ!**

Далёка не ўсе ўдзельнікі перадвыбарнай гонкі скарысталіся прадастаўленай ім магчымасцю звярнуцца да электарату па радыё і тэлебачанні. Самым дэмакратычным і найбольш актуальным для навічкоў старшыня ЦВК назвала зварот да аўдыторыі па радыё. Маўляў, не ўсе кандыдаты здольныя свабодна трымацца перад камерай. Скардзіліся ж кандыдаты па большай частцы на тое, што час трансляцыі іх выступленняў быў перасунуты на пяць хвілін. У якасці суцяшэння старшыня Цэнтрвыбаркама прапанавала прыемную навіну:

— Прынятае беспрэцэдэнтнае палітычнае рашэнне, — падкрэсліла спадарыня Ярмошына, — перш за ўсё таму што гэта і насустрач АБСЕ — менавіта місіяй выказвалася прапанова аб павелічэнні часу для перадвыбарных выступленняў па тэлебачанні і радыё. У сувязі з тым, што застаўся нявыкарыстаны эфірны час — у нас кандыдатаў менш, чым запланавана, — прынята сумеснае рашэнне з Белтэлерадыёкампаніяй аб тым, што з панядзелка з 19 да 20 гадзін (тэлеканал «СТБ» — з 19.00 да 19.30) тэлерадыёкампаніі зробяць паўтор запісаў тых перадвыбарных выступленняў, якія ўжо выходзілі ў эфіры.

Час паўтораў па тэлебачанні, зразумела, будзе праанансаваны. Да пачатку датэрміновага галасавання ўсе запісы выступленняў кандыдатаў будуць паўторна прадстаўлены ўвазе выбаршчыкаў. Прыгадаўшы магчымасці кандыдатаў выступіць у друку, старшыня Цэнтрвыбаркама адзначыла: «Мы працуем настолькі нефармальна, што дазваляем рэдакцыям прымаць перадвыбарныя праграмы пазней за ўстаноўлены тэрмін». Зыходзячы з таго, якія палёгкі сёлета прынятыя, Лідзія Ярмошына падкрэсліла, што гэта кампанія прызвана разбурыць усе стэрэатыпы. У сувязі з гэтым яна выказала спадзяванне, што выбары будуць прызнаныя.

— Усе органы, ад якіх залежыць рэалізацыя кандыдатамі іх права на ўдзел у выбарах, працуюць вельмі гібка і вырашаюць усе сітуацыі, якія ўзнікаюць у ходзе данай кампаніі, — запэўніла старшыня ЦВК.

**Ала МАЧАЛАВА.**

# ВЫЛУЧАЛЬНЫЯ ВЫЛУЧЭНЦЫ

***Сярод магчымых кандыдатаў у сенатары — не адна знакамітая асоба***

Вылучэнне кандыдатаў у сенатары скончыцца 15 верасня. У сераду пройдзе іх рэгістрацыя падчас пасяджэння Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў. Аб гэтым паведаміла журналістам старшыня ЦВК Лідзія Ярмошына. Паводле яе інфармацыі, сенатарамі ў Беларусі патэнцыйна могуць стаць 19 жанчын, 13 дзяржслужачых, 22 кіраўнікі розных арганізацый, тры рэктары ВНУ. Пры гэтым 15 вылучэнцаў раней з'яўляліся членамі Савета Рэспублікі. Сярод кандыдатаў таксама «заўважаны» і вельмі вядомыя ў краіне персоны: дзеючы кіраўнік верхняй палаты Генадзь Навіцкі і дзеючы кіраўнік Палаты прадстаўнікоў Вадзім Папоў, старшыня праўлення ААТ «ААБ Беларусбанк» Надзея Ермакова і першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Анатоль Рубінаў, эксміністр сацыяльнай абароны Антаніна Морава і экс-пасол Беларусі ў Канадзе і Францыі Ніна Мазай…

Нагадаем, што агульная колькасць членаў Савета Рэспублікі — 64. Кожная вобласць і сталіца вылучаюць па восем кандыдатаў, а пасля выбараў яшчэ васьмярых прызначае кіраўнік дзяржавы.

**Ала МАЧАЛАВА.**

ISSN 1990 - 763X

ОАО «СОЛИГОРСКИЙ РАЙАГРОСЕРВИС» (ПРОДАВЕЦ) СОВМЕСТНО С КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

**ПОВТОРНО ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**по продаже административно-хозяйственного здания (2-этажное кирпичное здание конторы), об. пл. 469,9 кв.м, расположенного по адресу: Солигорский район, г.п. Красная Слобода, ул. Советская, д. 29 Г.**

Начальная цена с НДС – 95 417 672 бел. руб. Площадь земельного участка – 0,4474 га. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от **28.06.2008 г**.

**Аукцион состоится 23 сентября 2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321.** Заявления на участие и необходимые документы **принимаются по 22 сентября 2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326**.

**Контактный телефон (8017) 224 61 34.**

**Сайт в интернете: www.rlt.by**

УНП 690324015

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

**СООБЩАЕТ**

о снятии с аукционных торгов земельного участка для строительства и обслуживания жилого дома в **д. Котяги Михановичского с/с** площадью 0,2477 га, кадастровый номер 623684203601000184.

Извещение опубликовано в газете «Звязда» **от 16.08.2008 г**.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

БЕЛАРУСБАНК

**Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк»,**

*расположенное по адресу: 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32,*

**СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 19 СЕНТЯБРЯ 2008 ГОДА ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ СО СЛЕДУЮЩЕЙ ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:**

***1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.***

***2. О внесении изменений в Устав ОАО «АСБ Беларусбанк».***

Акционеры ОАО «АСБ Беларусбанк» могут ознакомиться с информацией по вопросам повестки дня и заполнить бюллетень для заочного голосования (до 17 сентября), а также с решениями, принятыми внеочередным Общим собранием акционеров банка (после 19 сентября) по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, комн. 704(в), а также в филиалах — областных (Минском) управлениях, филиалах банка.

**Дата окончания приема бюллетеней — до 17 сентября 2008 года.**

**Телефоны для справок: (8 017) 218 84 38, 218 87 72.**

УНП 100325912.

**ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО»**

**«25» сентября 2008 года в 14.30 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5,**

**ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ АУКЦИОН**

**по продаже объектов коммунальной собственности Узденского района и права заключения договора аренды земельного участка необходимого для их обслуживания**

**На аукционные торги выставляются предметы аукциона, включающие:**

1. Проходную завода (инв. № 623/С-7648), общей площадью 22,1 кв.м; склад (инв. № 623/С-7678), общей площадью 232,6 кв.м; склад (инв. № 623/С-7680), общей площадью 234,4 кв.м; котельную (инв. № 623/С-7677) с дымовой трубой, общей площадью 306,4 кв.м; модуль «Орск» (инв. № 623/С-7679), общей площадью 875,0 кв.м; цех картофелепродуктов и квасное отделение (инв. № 623/С-7649), общей площадью 1856,4 кв.м; спиртохранилище (инв. № 623/С-7814), общей площадью 131,4 кв.м; оборудование котельной (30 единиц), оборудование цеха картофелепродуктов (3 единицы), расположенные по адресу: Минская область, г. Узда, пер. Заводской, 1, принадлежащие на праве хозяйственного ведения районному унитарному предприятию «Узденское ЖКХ» и **право заключения договора аренды земельного участка**, отведенного для их обслуживания, площадью 3,4173 га, сроком на 99 лет. Введено ограничение в использовании земельного участка в связи с его расположением в водоохранной и прибрежной зоне реки Уздянка. **Начальная цена** предмета аукциона 771 977 085 рублей (в том числе: имущество — 600 599 490 рублей и право заключения договора аренды земельного участка — 171 377 595 рублей). **Сумма задатка** предмета аукциона 50 000 000 руб.

Подробное извещение о проведении аукциона опубликовано **в газете «Звязда» от 17 июля 2008 г. № 131**.

2. Здание химчистки-прачечной-котельной (инв. № 623/С-7851), 1977 года постройки, общей площадью 475,8 кв.м, расположенное по адресу: Минская область, Узденский район, г. Узда, ул. К. Маркса, 35, принадлежащее на праве хозяйственного ведения коммунальному унитарному предприятию «Узденский районный комбинат бытового обслуживания», и **право заключения договора аренды земельного участка** площадью 0,1185 га, отведенного для обслуживания недвижимого имущества, сроком на 99 лет. **Начальная цена** предмета аукциона 445 840 535 рублей (в том числе: недвижимое имущество — 440 376 204 рублей и право заключения договора аренды земельного участка — 5 464 331 рубль). **Сумма задатка** предмета аукциона 25 000 000 рублей.

Подробное извещение о проведении аукциона опубликовано в **газете «Звязда» от 5 августа 2008 г. № 144**.

Договор купли-продажи имущества и договор аренды земельного участка с участником, ставшим победителем аукциона, будут заключены после внесения победителем аукциона платы, взимаемой за право заключения договора аренды земельного участка, возмещением затрат по подготовке и проведению аукциона, а также расходов, связанных с формированием земельных участков, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельных участков. Все **расчеты по сумме задатка** производятся путем перечисления их на расчетный счет фонда «Минскоблгосимущество» № 3642000000028 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНН 100128686. Заявки на участие в аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 312, тел. 224 57 09, (8 01718) 55845**. Последний день подачи заявок 23 сентября 2008 г. до 17.00.

УНП 600119335.

## Беларускаму аўтамабільнаму заводу прысуджаны Ганаровы дзяржаўны сцяг Беларусі

Ганаровы дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь за асаблівыя дасягненні ў гаспадарчым развіцці прысуджаны Рэспубліканскаму ўнітарнаму вытворчаму прадпрыемству «Беларускі аўтамабільны завод». Адпаведны ўказ 11 верасня падпісаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Абзац

■ Гомельскага ўрача ведаюць у Еўропе, Амерыцы і Японіі. Гаворка ідзе пра Юлію Чэрнікаву, кандыдата медыцынскіх навук, асістэнта кафедры траўматалогіі і артапедыі гомельскага медыцынскага інстытута, ардынатара гарадской клінічнай бальніцы № 1. Урач прапанавала лячыць астэартрыты, выкарыстоўваючы сываратку крыві самога хворага. А гэта — нетрадыцыйны метад, які існуе за мяжой і які не выклікае ў чалавека такой непажаданай з'явы, як алергія, бо сываратка крыві сумяшчальная з арганізмам пацыента. І яшчэ адна немалаважная дэталь: прапанаванае лячэнне ў некалькі разоў таннейшае па расходах, чым тое традыцыйнае. Юлія Чэрнікава на Міжнародным кангрэсе ў Ганконгу атрымала прэстыжную прэмію Міжнароднага таварыства хірургаў, артапедаў і траўматолагаў SICOT і была прызнана лепшай жанчынай-траўматолагам узростам да сарака гадоў, якая вызначалася на навуковай ніве. Дарэчы, распрацоўкай гамяльчанкі зацікавіліся ўжо ў Японіі, Амерыцы і еўрапейскіх краінах.

■ **Спецыялісты Бярэзінскага біясфернага запаведніка сумесна з вучонымі біясфернага запаведніка «Паўночныя Вагезы» (Францыя) вывучаюць відавую разнастайнасць стракоз на тэрыторыі беларускага запаведніка. Тут жыве 37 відаў стракоз, тры з якіх занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі.**

■ Наручны гадзіннік, што належаў Альберту Эйнштэйну, будзе прададзены на аўкцыёне ў Нью-Ёрку. Ён выкананы ў 1930 годзе з жоўтага золата з выцягнутым цыферблатам. Гадзіннік быў падораны заснавальніку тэорыі адноснасці на вячэры ў яго гонар у Лос-Анджэлесе. Гадзіннік пойдзе з малатка мінімум за $25—35 тыс.

■ **Інфармацыйнае агенцтва Reuters агучыла вынікі даследавання, праведзенага сярод амерыканскіх хатніх гаспадынь. Згодна з вынікамі даследавання, калі б праца хатніх гаспадынь аплачвалася па тых жа тарыфах, па якіх атрымліваюць сваю зарплату кухар, прыбіральшчыца, псіхолаг, пакаёўка, выхавальнік дзіцячага садка, прачка, генеральны дырэктар, тэхнічны асістэнт, то іх гадавы даход склаў бы 138 тысяч долараў. І нават калі выкананне хатніх абавязкаў спалучаецца з асноўнай працай, дадатковы даход жанчыны ў сям'і склаў бы $85 939 за год.**

■ З розніцай у адзін дзень на тэрыторыі Калінкавіцкага лясгаса былі затрыманы дзве групы паляўнічых, якія незаконна палявалі тут, выкарыстоўваючы незарэгістраваныя ружжы, транспартныя сродкі і лямпы-фары. Першымі амаль у дзве гадзіны ночы за гэтым заняткам дзяржінспектары і міліцыянеры затрымалі траіх непрацуючых. А праз дзень а палове трэцяй ночы на незаконнай здабычы дзіка папаліся электрамеханік і машыніст з чыгункі.

## Поўны абзац

■ **Скура амерыканкі набыла серабрысты колер з-за працяглага выкарыстання кропляў у нос, якія ўтрымліваюць калоіднае срэбра. 66-гадовая жанчына пачала прымяняць кроплі ў нос для лячэння алергіі пачынаючы з 11 гадоў. Праз некалькі гадоў яна заўважыла, што яе скура стала серабрыста-шэрай. Біяпсія паказала, што ў яе скуры ўтрымліваюцца часцінкі калоіднага срэбра. Нават пасля правядзення працэдуры «шліфоўка скуры» колер апошняй не памяняўся.**

■ Настаўнік амерыканскай сярэдняй школы атрымаў некалькі сінякоў і вялікую драпіну на спіне, калі ехаў на заняткі на веласіпедзе і сутыкнуўся з мядзведзем. Ён ехаў з хуткасцю 40 км/гадз., калі заўважыў перад сабой чорнага мядзведзя вышынёй каля 3 м. Мужчына не змог спыніцца і ўехаў у бок жывёліны. Праляцеўшы праз руль, амерыканец ударыў мядзведзя шлемам у спіну, а затым яны абодва скаціліся з дарогі. Мядзведзь, пераскочыўшы праз галаву чалавека, разламаў шлем і падрапаў спіну, а затым знік. Жонка настаўніка прыехала на месца здарэння і адвезла мужа ў бальніцу.

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

**Утерянный** филиалом Белгосстраха по г. Минску **бланк страхового полиса** по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу **серии БЛ № 376211**, считать **недействительным**.

**ОАО «Экспериментальный завод им. Н. Гастелло»,**
**220073, г. Минск, ул. Пинская, 18**

**ИЗВЕЩЕНИЕ**
о созыве внеочередного общего собрания акционеров

Собрание состоится 26 сентября 2008 г. в 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Пинская, 18, актовый зал Общества. Регистрация участников собрания производится в день и по месту проведения собрания с 14.30 до 15.45.

Повестка дня:

***1. О результатах закрытой подписки на акции дополнительного выпуска ОАО «Экспериментальный завод им. Н. Гастелло».***

***2. О совершении сделок, в которых имеется заинтересованность аффилированных лиц.***

С информацией (материалами), подлежащими представлению акционерам при подготовке к проведению собрания, акционеры могут ознакомиться ежедневно (кроме субботы и воскресенья) начиная с 19 сентября 2008 г. в приемной Общества с 9.00 до 16.00, а в день проведения собрания — по месту его проведения.

Наблюдательный Совет ОАО «Экспериментальный завод им. Н. Гастелло».

УНН 100010116.

*ЗАВЕРЯЮ:*
Начальник управления по ценным бумагам
Главного управления Министерства финансов
Республики Беларусь по городу Минску
В.Н. Омельянович
10 сентября 2008 г.

**ПРЕДЛОЖЕНИЕ**
**о покупке акций**

| | |
|---|---|
| 1. Полное наименование и местонахождение покупателя акций | Открытое акционерное общество «Центроэнергомонтаж» 220033 г. Минск, Велосипедный переулок, 7 |
| 2. Полное наименование, местонахождение эмитента, акции которого приобретаются | Открытое акционерное общество «Центроэнергомонтаж», 220033 г. Минск, Велосипедный переулок, 7 |
| 3. Количество акций, которое намеревается приобрести покупатель (штук) | 100 000 (сто тысяч) в том числе: код выпуска BY6236180372 — 80 000 штук, код выпуска BY6236136465 — 20 000 штук |
| 4. Цена, по которой покупатель намерен приобретать акции | 20 000 (двадцать тысяч) белорусских рублей |
| 5. Сроки, форма и порядок оплаты акций | В течение 30 (тридцати) календарных дней с даты зачисления акций на счет «депо» покупателя, денежными средствами путем «безналичного перечисления» в порядке, установленном системой ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» |
| 6. Адрес, по которому будут заключаться договоры купли-продажи акций | 220013 г. Минск, улица Сурганова, 48а ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» |
| 7. Даты начала срока представления предложений акционеров на продажу акций<br>Даты окончания срока представления предложений акционеров на продажу акций | 18 сентября 2008 года<br>15 октября 2008 года |
| 8. Даты начала заключения договоров купли-продажи акций<br>Даты окончания заключения договоров купли-продажи акций | 17 октября 2008 года<br>31 октября 2008 года |
| 9. Телефон для справок | 298 44 69 |

УНП 100092167

# «ДАЖЫНКІ» ПА-СТАЛІЧНАМУ

### *У Мар'інай Горцы Міншчына святкуе рэкордны ўраджай*

**Сёння ў Мар'інай Горцы пройдзе абласны фестываль-кірмаш «Дажынкі-2008». На свята ў Пухавіцкі раён прыедуць каля тысячы лепшых працаўнікоў вёскі з усёй сталічнай вобласці, паведаміў першы намеснік старшыні аблвыканкама Віктар Шчацько. Гасцей і ўдзельнікаў фестывалю кірмашу чакаюць разнастайныя культурная і спартыўная праграмы. Адбудзецца ўшанаванне пераможцаў абласнога спаборніцтва на жніве-2008. Заслужаныя ўзнагароды працаўнікі сельскіх гаспадарак атрымаюць ад старшыні Мінскага аблвыканкама Леаніда Крупца.**





Міншчына сёлета і сапраўды сабрала рэкордны ўраджай. Калі дагэтуль непераўзыдзеным лічыўся валавы збор 1987 года (тады было намалочана 2 мільёны 154 тысячы тон збожжа), то сёлета гэта лічба паявілічана. Ураджай-2008 у сталічнай вобласці — 2 мільёны 273 тысячы тон. І гэта не канчатковы вынік. Сюды не ўвайшлі 155 тысяч тон масласемя азімага рапсу, працягваецца абмалот рапсу яравога, наперадзе і ўборка кукурузы. Сярэдняя ўраджайнасць па вобласці склала 38 цэнтнераў з гектара. Асабліва ўраджайнымі былі сёлета нясвіжскія палеткі. Ураджайнасць тут складала 69 цэнтнераў з гектара, а валавы збор — 155 тысяч тон збожжа.

Да VII абласнога фестывалю рыхтавалася і Мар'іна Горка. Раённы цэнтр змяніўся і набыў самы сучасны выгляд. У горадзе пакладзена 10 тысяч квадратных метраў пліткі, сфарміраваны тратуары, якія не толькі ўпрыгожваюць горад, але і робяць яго больш камфортным для жыхароў. Змянілася цэнтральная плошча горада. Плітка пакладзена так, што ад цэнтральнага круга адыходзяць промні-дарожкі, за што сярод мясцовых жыхароў за ёй замацавалася назва «Сонечная». Першымі, хто апрабуе абноўленую плошчу Мар'інай Горкі, стануць госці абласных «Дажынак».

Сёлетні абласны фестываль «Дажынкі-2008», дарэчы, пройдзе ледзь не ў самым геаграфічным цэнтры Беларусі — за некалькі кіламетраў ад Мар'інай Горкі, паблізу вёскі Антонава ўстаноўлены адпаведны геадэзічны знак. Мар'іна Горка з'яўляецца малой радзімай нашых шматлікіх славутых землякоў. Тут нарадзіліся кампазітар Ігар Лучанок, стваральнік славутага аркестра народных інструментаў Іосіф Жыновіч, пісьменнік, гісторык, публіцыст Аляксандр Ельскі, сучасныя пісьменнікі Таісія Бондар і Алесь Бачыла.

**Алена КРАВЕЦ.**

# ЧАЙ З НАВІНАМІ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

***У дом Наталлі і Мікалая БУЛАТОЎСКІХ «Звязда» прыходзіць не першы год, і таму ў вёсцы Хвойнік Пружанскага раёна нашы адданыя чытачы — менавіта гэтая сям'я. Ранішні кубачак чаю з любімай газетай для іх не проста душэўны занятак — традыцыя.***

НЕСВИЖСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
1 ОКТЯБРЯ 2008 г.

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**на право заключения договора аренды земельного участка для строительства и обслуживания базы придорожного сервиса**

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер, арендодатель | Площадь земельного участка | Срок аренды, лет | Начальная цена (бел. руб.) | Задаток (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 6. | Минская обл., Несвижский р-н (автомобильная дорога Р-91 Осиповичи—Барановичи 151,4—151,6 км) 624250100001003814, арендодатель — Несвижский районный исполнительный комитет | 5,0000 га | 99 | 128593128 | 12859310 |

**Аукцион состоится 01.10. 2008 г. в 11.00 в здании Несвижского районного исполнительного комитета: г. Несвиж, ул. Советская, 1.**

При подаче документов на участие в аукционе уполномоченные лица предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 30.09.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Несвиж, ул. Советская, 1, кабинет 312.**

Задаток перечисляется на р/с 3642200070020 в филиале № 620 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 523, г. Несвиж, УНП 600038472, назначение платежа 04901, Несвижский районный исполнительный комитет.

Участник, ставший победителям аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка внести плату за предмет аукциона, возместить расходы, связанные с проведением аукциона, подготовкой документации; не позднее 2 рабочих дней после внесения платы за предмет аукциона, возмещения расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации, заключить договор аренды земельного участка.

Иные обязанности победителя аукциона и порядок проведения аукциона оговорены в условиях его проведения.

**Контактный телефон (801770) 5 48 65**, ( моб. 6152111).

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

**ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Марьина Горка:

| | Лот 1 | Лот 2 | Лот 3 |
|---|---|---|---|
| Адрес земельного участка, кадастровый номер | г. Марьина Горка, ул. Советская, 624450100001002641 | г. Марьина Горка, ул. Калинина, 624450100001002650 | г. Марьина Горка, ул. Стадионная, 624450100001002626 |
| Общая площадь земельного участка | 0,0198 га | 0,0171 га | 0,0480 га |
| Целевое назначение земельного участка | для строительства кафе | для строительства кафе | под установку торгового павильона по продаже продовольственных товаров |
| Срок аренды земельного участка | 50 лет | 50 лет | 50 лет |
| Начальная цена права заключения договора аренды земельного участка | 2 933 760 рублей | 2 018 304 рублей | 7 203 360 рублей |

Подробные извещения опубликованы в газете «Звязда» от 13.05.2008 г., 07.06.2008 г., 08.07.2008 г. **Аукцион состоится 30.09.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 321.** Заявление на участие и необходимые документы принимаются по 29.09.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 326. Контактный телефон **(8017) 224 61 34.** Сайт в интернете: **www.rlt.by.**

УНП 690324015

**Кватэрнае пытанне**

# ЧЭКІ МОЖНА ПАДАРЫЦЬ...

**Мы жывём у прыватным доме, у паляпшэнні жыллёвых умоў патрэбы не маем. На якія мэты можна выкарыстаць чэкі «Жыллё»?**

**Л. Шабунь,** *Мінская вобл.*

Перш за ўсё, неабходна адзначыць, што пасля 1 студзеня 2007 года знаходзяцца ў абарачэнні і выкарыстоўваюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам толькі перарэгістраваныя чэкі «Жыллё».

У выпадку, калі ўладальнік перарэгістраваных чэкаў «Жыллё» не мае патрэбы ў прыватызацыі займаемага жылога памяшкання (або яно не падлягае прыватызацыі), а таксама ў індэксацыі чэкаў для выкарыстання іх на фінансаванне будаўніцтва, рэканструкцыі або набыцця жылля, то ён можа падарыць іх па натарыяльна засведчаным дагаворы сваім блізкім родным (мужу (жонцы), бацькам, дзецям, усынавіцелям, усыноўленым, родным братам і сёстрам, дзядулі, бабулі, унукам).

Гэтыя родныя, у сваю чаргу могуць выкарыстоўваць ва ўстаноўленым парадку падараныя чэкі «Жыллё» для прыватызацыі займаемых імі жылых памяшканняў у дамах дзяржаўнага жыллёвага фонду альбо для паляпшэння сваіх жыллёвых умоў.

Права ўласнасці на імянныя прыватызацыйныя чэкі «Жыллё» можа перайсці да іншых грамадзян таксама ў спадчыну або па рашэнні суда.

**Віктар САВІЦКІ.**

# У маршрутах руху — змяненні

**У сувязі з правядзеннем сёння Мінскага міжнароднага марафону ў сталіцы з 10.30 да 16.30 будуць зменены трасы шэрагу маршрутаў грамадскага транспарту.**

Паводле інфармацыі КУП «Мінсктранс», гэта датычыцца аўтобусных маршрутаў №№ 1, 63, 69, 73, 91, 29, 44, 136, 77, 576, 589. Таксама будуць зменены маршруты экспрэсных аўтобусных маршрутаў — №№ 1029-Т, 1051-Т, 1055-Т, 1056-Т, 1117-Т, 1073-Т, 1186-Т, 1089-Т, 1097-Т, 1233-Т, 1416-Т. Калі гаварыць пра тралейбусныя маршруты, дык гараджанам і гасцям сталіцы трэба будзе ўлічваць, што змяненні закрануць маршруты №№ 10, 39 і 28. Работа тралейбуснага маршрута № 21 увогуле не плануецца.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

**Сітуацыя**

# «Я АПІСАЛА СВОЙ ДОМ НА ЎНУКАЎ...»

**У нашу газету, як і ў іншыя выданні, прыходзяць лісты, у якіх састарэлыя людзі просяць парады і дапамогі.**

**«Я апісала свой дом на ўнукаў і цяпер мне няма месца ў сваёй хаце. Як вярнуць яе назад?» ці «Сваю кватэру я падарыла сыну, а ён п'е гарэлку і не хоча мяне слухаць. Дапамажыце мне выселіць сына, каб я магла спакойна дажыць свой век».**

**«Вы можаце паспрабаваць зрабіць гэта праз суд», ці «Вам ужо ніхто не дапаможа», — адказваюць юрысты.**

**Але што прымушае людзей, якія яшчэ не збіраюцца паміраць у бліжэйшы час, аддаваць адзінае, што ў іх ёсць — жыллё? І самае важнае, што з некалькіх дзяцей яны выбіраюць адно, якое, па іх разуменню, даглядзіць іх на старасці.**

**І як паказвае жыццё, у такіх сітуацыях праблему ствараюць самі састарэлыя, ніхто ў гэтым не вінаваты, акрамя іх.**

### ГІСТОРЫЯ ПЕРШАЯ

Падобных гісторый многа, але гэтую я пачуў ад знаёмай. З Вольгай Адамаўнай нейкі час даводзілася разам выгульваць сваіх сабак, і аднойчы жанчына расказала эпізод са свайго жыцця.

— Да мяне свякроў напачатку адносілася добра, а ўсё змянілася, калі з Расіі вярнулася дачка — абмянялася кватэрай. Тут свякроў стала другой. «У мяне ўся надзея на дачушку, — гаварыла старая, — толькі яна мяне дагледзіць і пахавае». А калі свякроў падарыла дачцэ сваю кватэру, і тая з сынам перайшла да яе жыць, а сваё жыллё прадала, то наша сям'я стала быццам бы чужой. Мінуў час і неяк свякроў звоніць ды плача ў трубку. Унук пазычыў у яе 500 долараў, а калі праз некалькі месяцаў бабуля напомніла, што агавораны тэрмін прайшоў і грошы трэба вярнуць, любімы ўнук і «наехаў» на бабу.

— Я цябе, старая б..., зараз з балкону выкіну і ўсе табе долары будуць, — вызверыўся ўнук.

— І гэта ж мяне, з маёй кватэры выкідваць сабраўся, — скардзілася старая.

— А што ты ад мяне хочаш? — пытаецца сын. — У цябе ёсць дачушка, то і разбірайся з ёю.

Можа з гэтай прычыны, а найхутчэй з таго, што там скандалы былі часта, у свекрыві здарыўся інсульт.

Муж хоць і злаваў, а кажа, што трэба праведаць хворую. Як ні круці, а маці. Прыйшлі мы туды, а як толькі дзверы адчыніліся, то цяжкае паветра ўдарыла ў твар. Зайшлі ў пакой, а каля ложка гара нямытых прасцін, на крэсле — талерка з засохлай кашай. Павярнулі старую, а на крыжы — пролежні.

А дачка стаіць побач і скардзіцца:

— Ні хвіліны спакою — удзень на рабоце, а ноччу не заснеш — і так круглыя суткі.

Калі мой сабака даходзіў, то ён ляжаў на чыстай падсцілцы. Мыла на дзень па некалькі разоў. Хоча папіць, падыме галаву, то падасі..., а тут чалавек жывы гніе.

Дома мы пагаварылі і забралі старую да сябе. Гаварыць яна не магла, хоць чула і пры памяці была. Іншым разам пераварочваю яе, абмываю і не ўстрымаюся: «І дзе ваша любімая дачушка, і дзе ж адзіная надзея?»

Тры гады даглядала хворую і не ведаю, што яна там думала, але калі іншым разам прыходзіла дачка, то па вачах было відаць, як свякроў ажывае. Сэрцам яна была з дачкой.

* * *

Маці зразумець можна. Дачка без мужа, то і хацелася ёй дапамагчы, але сітуацыя была б зусім іншая, калі б не спяшалася адпісваць на дачку кватэру. А галоўнае, што не дачка з унукам, а нявестка аказалася на вышыні.

Але найчасцей бацькі на старасці паводзяць сябе менавіта так — з дзяцей выбіраюць сабе даглядчыка і нашчадка, а жыццё можа так павярнуць...

«Я падарыла сваёй дачцэ кватэру, а яна праз некалькі гадоў памерла. Цяпер кватэра належыць зяцю. Што трэба зрабіць, каб вярнуць яе?» — пытаецца чытачка нашай газеты.

### ГІСТОРЫЯ ДРУГАЯ

Калі састарэлыя занядужалі, то аб'явілі дзецям, што іх даглядаць будзе старэйшы. З чатырох дзяцей яны выбралі Міхаіла невыпадкова, бо шкадавалі. Ён быў у разводзе, любіў выпіць і жыў з двума сынамі ў райцэнтры. Тыя таксама ад бацькі далёка не адышлі, і на кватэры ў іх часта гуляў-весяліўся мясцовы «адстой».

Калі старэйшы перайшоў да бацькоў, то і яго сыны таксама аселі ў дзеда з бабай. Старыя думалі, што будуць трымаць сітуацыю пад кантролем, але ўтрымаць трох мужыкоў, якія штодня пакутуюць ад смагі, аказалася ім не пад сілу. Напачатку сын з унукамі ўзяліся за гарэлку, якую бацькі прыхавалі на памінкі. Чатыры скрынкі «Асобай», «Пшанічнай» ды «Маскоўскай» трыццаць гадоў стаялі прыхаванымі ў розных закутках, але да памінак не выстаялі. Берaглі састарэлыя тую гарэлку, асабліва гаспадыня трэслася над кожнай бутэлькай, а тут цішыня — бацькі маўчаць.

А здаралася, як вып'юць, то пачынаюць біцца і тады суседзі бягуць раздымаць.

Вядома ж, што навесці парадак можна было б, але калі дочкі прыязджалі, то бацькі ў адзін голас: «Не мяшайцеся, не ваша справа...», а праз нейкую хвіліну, калі побач не было «даглядчыкаў», скардзіліся: «Каб вы толькі ведалі, што тут робіцца» і тут жа: «Ціха, ціха. Не трэба шуму. І як яны без нас жыць будуць?!»

Першым памёр стары і ўжо з маці ніхто не цырымоніўся. Суседзі раілі выклікаць міліцыю і выгнаць з хаты, але старая на сваім: «Няхай мяне хоць заб'юць, але я выганяць не буду». А праз нейкі час злягла і неўзабаве памерла.

* * *

Вось у старых чацвёра дзяцей і пры любым раскладзе пытанне аб доглядзе вырашылася б, тым больш, што ў трох нармальныя сем'і. Але ж выбіраюць самага няўдалага, якога шкадуюць. А калі чалавек не здолеў стварыць сваю сям'ю, калі ў яго жыццё зрабіла збой, то якая тут надзея... І не трэба забываць, што калі старым ужо за восемдзесят, далёка не заўсёды яны ўспрымаюць жыццё адэкватна, часта жывуць мінулым і гэта пры тым, што свет даўно змяніўся.

А яшчэ, аддаючы перавагу аднаму з дзяцей, бацькі ўносяць між імі разлад. «Калі вы выбралі сабе даглядчыка і аддалі яму кватэру і грошы, то пры чым тут мы?! Разбірайцеся ва ўсім самі», — чуюць у адказ састарэлыя.

Часта найбольшы вораг чалавеку — ён сам. Меў бы ён маёнтак, то, магчыма, і можна было б падумаць аб падзеле, а то пры жыцці апісваюць адзіную кватэру, а затым просяць дапамогі — хочуць адабраць назад ужо ў нелюбімага дзіцяці.

Хіба можна ведаць, што ў сына, дачкі ці ўнука ў галаве? А калі дзіця няўдалае пры жыцці бацькоў, то няўжо яно раптоўна зменіцца пасля іх смерці? Бывае, але як выключэнне.

### ПАСЛЯСЛОЎЕ

Праблема, узнятая ў гэтым артыкуле, была актуальнай і ў мінулыя стагоддзі. Успомнім лёс караля Ліра з аднайменнага твора Шэкспіра. Кароль на старасці вырашыў падзяліць сваё каралеўства, каб дажыць свой век спакойна. Палову дзяржавы аддаў адной дачцэ, а палову — другой. Але як толькі дачушкі прыхапілі каралеўства, з бацькам не сталі важдацца і стаў былы кароль жабраком.

Класічны прыклад, а мы носімся з двухпакаёўкамі ці даваеннымі хаткамі-развалюхамі і спадзяёмся, што за гэта дзеці павінны нас на старасці любіць і шанаваць. Не атрымаецца, калі раней не навучылі гэтаму.

Як ні сумна, але, як правіла, чалавек падыходзіць да парога вечнасці ў самоце. А ў дзяцей сваё жыццё, ім яшчэ бачыцца перспектыва, хоць яна можа быць толькі прывідам.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

НЕСВИЖСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
1 ОКТЯБРЯ 2008 г.

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов, продавец Несвижский сельский исполнительный комитет:**

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Наличие инженерных сетей | Начальная цена (бел. руб.) | Задаток (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Минская обл., Несвижский р-н, Несвижский с/с, д. Заозерье, ул. Землеустроительная, 21, 624283502601000311 | 0,0813 | Газ, водопровод, электричество | 600657 | 60070 |
| 2. | Минская обл., Несвижский р-н, Несвижский с/с, д. Заозерье, ул. Землеустроительная, 23, 624283502601000312 | 0,0815 | | 602135 | 60210 |
| 3. | Минская обл., Несвижский р-н, Несвижский с/с, д. Заозерье, ул. Землеустроительная, 25, 624283502601000313 | 0,0822 | | 607307 | 60730 |
| 4. | Минская обл., Несвижский р-н, Несвижский с/с, д. Заозерье, ул. Землеустроительная, 27, 624283502601000314 | 0,1149 | | 848900 | 84890 |
| 5. | Минская обл., Несвижский р-н, Несвижский с/с, д. Заозерье, ул. Летняя, 7, 624283502601000310 | 0,0822 | | 607307 | 60730 |

**Аукцион состоится 01.10.2008 г. в 11.00 в здании Несвижского районного исполнительного комитета: г. Несвиж, ул. Советская, 1.**

**Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни по 30.09.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Несвиж, ул. Советская, 1, кабинет 312.** При подаче документов граждане, представитель граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Задаток перечисляется на р/с 3642200070020 в филиале № 620 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 523, г. Несвиж, УНП 600038472, назначение платежа 04901, Несвижский районный исполнительный комитет.

Победитель аукциона в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона обязан внести плату за земельный участок, возместить расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения. Иные обязанности победителя аукциона и порядок проведения аукциона оговорены в условиях его проведения.

**Контактный телефон (801770) 5 48 65**, (моб. 6152111).

Вучэнне «Бастыён-Антытэрор-2008»

# СУПРАЦЬ ТЭРАРЫЗМУ — УСІМІ «СІЛАВЫМІ»

## Карэспандэнт «Звязды» атрымала магчымасць убачыць, якімі павінны быць дзеянні ўсіх сілавых структур падчас вынішчэння тэрарыстаў

«Тэрарысты» мелі намер нелегальна перасекчы Дзяржаўную мяжу Рэспублікі Беларусь, а таксама захапіць закладнікаў на самалёце.


Фота БЕЛТА.

групы праз мяжу быў створаны рэспубліканскі аператыўны сітуацыйны штаб пад кіраўніцтвам 1-га намесніка старшыні КДБ Віктара Вягеры, прыняты шэраг тэрміновых мераў — разгорнуты блок-пасты, выстаўлены дадатковыя пагранічныя нарады і г.д.


Фота БЕЛТА.

...«Тэрарысты» набліжаюцца да міліцэйскага кантрольна-прапускнога пункта, дзе спыняюцца для прадастаўлення дакументаў, замест чаго, зразумела, аказваюць узброенае супраціўленне, кідаюць машыну і спрабуюць схавацца ў лесе. Прыцягненне да аперацыі верталётаў МІ-8 дазваляе не толькі весці паветраную разведку — назіраць за перасоўваннем злачынцаў па мясцовасці, але і высадзіць разведгрупу звычайным і беспасадачным спосабам, які можа ажыццяўляцца з вышыні 25—50 метраў.

Штурмавая спецгрупа прадэманстравала, якім чынам развіваліся б падзеі, калі б тэрарысты занялі адзін з будынкаў. У справе былі б задзейнічаны бронетэхніка, верталёт, службовыя сабакі, спецсродкі... Пасля прапановы здацца, штурмавая група адкрывае агонь і «бярэ» будынак. Усе, хто ў абодвух выпадках з ліку «тэрарыстаў» застаецца жывы, аказваюцца ў рэшце рэшт блакіраванымі і абясшкоджанымі.


Фота Артура СТРЭХА.

На шчасце, абодва сцэнарыі не мелі месца ў рэальным жыцці. Пастаноўкі былі распрацаваны і фактычна бездакорна «разыграны» ў межах сур'ёзнай падзеі міжнароднага значэння. На гэтым тыдні Камітэт дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь пад эгідай Антытэрарыстычнага цэнтра СНД правёў збор кіруючага складу антытэрарыстычных падраздзяленняў органаў бяспекі і спецыяльных службаў дзяржаў — удзельніц СНД, а таксама сумеснае аператыўна-стратэгічнае камандна-штабное вучэнне «Бастыён-Антытэрор-2008». У мерапрыемствах узялі ўдзел назіральнікі Расіі, Казахстана, Арменіі, Малдовы, Латвіі, Ізраіля і іншых краін.

Першы сцэнарый быў пастаўлены на «сцэне» 227 агульнавайсковага палігона сухапутных войскаў, што ў Барысаўскім раёне. Згодна з планам, злачынная група «ўмоўных» тэрарыстаў захапіла аддзел міліцыі, зброю і аўтамашыну. Для папярэджання прарыву ўзброенай

Паводле вучэбнага сцэнарыя, на адным з беларускіх хутароў з мэтай незаконнага перасячэння граніцы хавалася каля тысячы чалавек са злачыннымі намерамі, у тым ліку адзін з лідараў міжнароднай тэрарыстычнай арганізацыі.

...Другой фазай вучэння «Бастыён-Антытэрор-2008» стала спецаперацыя па выслабаненні закладнікаў, захопленых тэрарыстамі на аб'екце паветранага транспарту ў Нацыянальным аэрапорце «Мінск-2». Упершыню ў вучэбнае дзеянне было вырашана дадаць складаны элемент — штурм пачаўся падчас руху самалёта. Група «Альфа» Камітэта дзяржбяспекі эвакуявала ўмоўных пасажыраў, злачынцаў і членаў экіпажа. Супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях аказалі тэрміновую дапамогу «параненым». Сапёр узняўся па трапу, адшукаў і выдаліў з борта самалёта выбуховае рэчыва...



Фота БЕЛТА.

Пасля правядзення вучэбных спецаперацый старшыня Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь Вадзім ЗАЙЦАЎ адзначыў, што кіраўнікі спецпадраздзяленняў СНД, безумоўна, выказваюць пажаданне, каб вопыт правядзення падобных аперацый ніколі не быў запатрабаваны. І тым не менш, сістэмны падыход у дзяржаўным рэагаванні і барацьбе з тэрарызмам неабходны кожнай сучаснай дзяржаве. Падрыхтоўка і прадуманасць дзеянняў рэальных тэрарыстаў прымушаюць свет быць гатовым да іх сюрпрызаў, дабівацца пры неабходнасці ўзгодненасці ў дзеяннях розных сілавых структур. Дарэчы, прадстаўнікі апошніх адзначаюць, што гаворка ідзе аб самым складаным «элеменце» ў спецаперацыях падобнага кшталту — каардынацыі дзеянняў Камітэта дзяржаўнай бяспекі, Дзяржаўнага пагранічнага камітэта, Міністэрства абароны, Міністэрства ўнутраных спраў і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Што ж датычыцца самой магчымасці рэагавання на злачынныя дзеянні ў рэспубліцы, то спецпадраздзяленні розных ведамстваў могуць імгненна апынуцца ў любой кропцы Беларусі.

Сёлетняе сумеснае вучэнне паказала, што абедзве яго фазы, як адзначыў камандзір групы «Альфа» Камітэта дзяржбяспекі Мікалай ІВІНСКІ, «прайшлі штатна, усё атрымалася, як задумана». Хоць і ў гэтай справе няма межаў для ўдасканалення, чарговы этап якога адбудзецца ў наступным годзе ва Украіне.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

# ГАРАДЗЕНСКАЯ АЎРА

## Гораду над Нёманам – 880 гадоў

**Напярэдадні сённяшняга свята ў Гродне адчыніў дзверы першы гіпермаркет, які прапануе пакупнікам каля 20 тысяч найменняў тавару. А яшчэ адна знакавая падзея, адкрыццё пасля рэканструкцыі стогадовага Старога моста цераз Нёман, адбудзецца крыху пазней, пасля выпрабаванняў на трываласць (дарэчы, чуткі аб трэшчыне ў апоры моста не маюць пад сабой ніякіх падстаў). Пасля чаго толькі практыкай будзе падведзены вынік даўнім спрэчкам сярод спецыялістаў-горадабудаўнікоў і тых, хто аналізуе транспартныя патокі з пункту гледжання звычайнага шафёра: ці хопіць абласному цэнтру трох цяперашніх мастоў альбо ўсё ж давядзецца будаваць і чацвёрты?**



Задоўга да свята быў аб'яўлены конкурс на стварэнне слоў і музыкі гарадскога гімна, у якім маглі паўдзельнічаць не толькі прафесіяналы, але і ўсе ахвотныя. На разгляд журы паступіла каля трыццаці кампазіцый, праўда, пераможцу пакуль не вызначылі. Мяркуецца, што пяць лепшых варыянтаў гэтага, можна сказаць, галоўнага гарадскога твора будуць прадстаўлены грамадскасці падчас святочных мерапрыемстваў. А затым, магчыма, сярод гараджан будзе праведзены своеасаблівы рэферэндум.

А вось з яшчэ адным сімвалам кожнага паважаючага сябе горада, гербам, у Гродне вызначыліся яшчэ ў XVI стагоддзі. Дакладней, яго падарыла гарадзенцам каралева Рэчы Паспалітай Бона. Першыя пячаткі з выявай аленя святога Губерта з залатым крыжам паміж рагамі датаваныя 1565 годам. Навокал горада размяшчаліся багатыя паляўнічыя ўгоддзі, а святы Губерт — гэта заступнік паляўнічых. Паводле легенды, аднойчы падчас палявання ён убачыў дзівоснага аленя з гэтым залатым крыжам і, натхнёны такой з'явай, стаў узорным хрысціянінам, раздаў бедным усю сваю маёмасць.

Пазней да герба была дабаўлена агароджа, праз якую скача алень — як сімвал свабодалюбства тутэйшага насельніцтва, няспыннага руху наперад, пераадолення ўсіх перашкод. А блакітны фон герба падкрэслівае духоўнасць і высакароднасць горада. Дарэчы, дваццаць гадоў таму, падчас распрацоўкі сучаснага герба ў некаторых галовах з'явіліся ідэі замяніць блакітны фон на іншы, а залаты крыж паміж аленевымі рагамі — на чырвоную зорку. Але, дзякуй Богу і тагачасным уладам, гістарычная канцэпцыя была захавана.

І хто сёння скажа, што герб арганічна не звязаны з жыццём горада? Мяркуйце самі. Няспынны рух наперад — гэта дзесяткі новых прадпрыемстваў, лідарства ў краіне ў будаўніцтве жылля, аснашчэнне самым сучасным абсталяваннем бальніц і паліклінік, кардынальна абноўленыя стадыён і фізкультурна-аздараўленчы комплекс... А духоўнасць і высакароднасць — не толькі ў гісторыка-культурных славутасцях каралеўскага горада, але і, мусіць, у тым, што тут палічылі неабходным патраціць вялікія сродкі на будаўніцтва прытулку для бяздомных.



Вольфганг, нямецкі сябар майго стрыечнага брата, ужо даўно пачаў цікавіцца наконт даты свята горада. У Гродна ён прыязджае амаль штогод і, кажа, быццам дадому. Вольфгангу вельмі падабаюцца нашы ўтульныя вулачкі, але найбольш — людзі, іх адкрытасць і добразычлівасць. І ў гэтым, пэўна, адзін з галоўных складнікаў гарадзенскай аўры. У людзях, якія адчуваюць сваю еднасць з родным горадам, адказнасць перад яго мінулым, за сённяшні і заўтрашні дзень. У прафесіяналах, якія імкнуцца зрабіць горад зручным для жыцця, працы і адпачынку, упрыгожыць яго кветкамі і паркавымі скульптурамі. А таксама і ў тых, хто з болем у душы ўспрымае памылковыя, на іх думку, рашэнні і перажывае за магчымыя наступствы больш, чым за нешта асабістае.





...Ужо некалькі гадоў у Гродне праводзіцца інтэрактыўная гульня «Night City» («Начны горад»). Людзі рознага ўзросту, прафесій і сацыяльнага статусу ў любое надвор'е, у снег і дождж накіроўваюцца ў падарожжа па гарадзенскіх аб'ектах, выяўляючы шмат цікавага ў самых нечаканых месцах. «Дзясяткі перачытаных старажытных фаліянтаў, энцыклапедый, эпасаў Гродзеншчыны...Напісана 15 дысертацый па гісторыі Гродна. Наш горад аказаўся ў цэнтры ўсіх гістарычных падзей сусветнай культуры. Сам Да Вінчы аказаўся гродзенцам. І Джаконда — наша дзяўчына. І ўсміхалася яна нашаму гродзенскаму хлопцу, — з гумарам гаворыць адзін з удзельнікаў гэтай гульні». А яго калега па захапленні ўжо зусім сур'ёзна сцвярджае: «Мы заразіліся ідэяй адраджэння нашага цудоўнага, неардынарнага горада, вяртання яму заслужаных лаўраў квітнеючага еўрапейскага горада, культурнага цэнтра Еўропы».

Са святам, Гродна!

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**
**Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.**

А на мой погляд...

# ШТО МОЖА ГАРАНТАВАЦЬ НАШУ БЯСПЕКУ І ЎПЭЎНЕНАСЦЬ У ЗАЎТРАШНІМ ДНІ?..

**У самым разгары час нарыхтовак, падрыхтоўкі да міжсезоннага перыяду. Работы вядуцца і ў гаспадарках, і на ўласных падворках, кухнях кватэр. Гаворка ідзе пра забеспячэнне ў тым ліку і харчовай і іншай бяспекі як увогуле краіны, так і асобна ўзятай сям'і.**

**Што ў вашым уяўленні гарантуе гэтую самую бяспеку, упэўненасць падчас надыходзячай зімы?**

**Антаніна ШЫМАНІЦА, пенсіянерка, вёска Стокі Свіслацкага раёна:**

— Здароўе. Раней яго хапала, каб усё рабіць самастойна. А працы, вы ж ведаеце, у вёсцы заўсёды шмат. Цяпер здароўе не тое, на жаль. Дзеці жывуць далёка, кажуць, што ім часта ездзіць няма часу, ды і эканамічна нявыгадна, маўляў, прасцей усё набыць або забраць мяне ў горад. Але пакуль неяк сумесна спраўляемся, бо сваё з агарода — не чужое. Балазе, дровы можна цяпер заказаць, а ўжо зяць неяк знойдзе час парэзаць іх, пасекчы. З агародам дапамагаюць трактарам, сёлета заплацілі, дык і збожжа змалацілі.

Алена Лужынская, шматдзетная маці, вёска Гардынава Валожынскага раёна:

— Нарыхтоўкі з уласнага агарода, саду: капусты, агуркоў, яблыкаў і г.д. Аб'ёмаў нам цалкам хапае, калі ўзнікне нейкая патрэба — можна на рынку нешта дакупіць. Але мы пакуль абыходзімся, наадварот, паколькі ў нас вялікі сад, прадалі лішкі яблыкаў на 300 тысяч рублёў.

**Аляксандр ЛАСТОЎСКІ, начальнік прэс-службы ГУУС Мінгарвыканкама:**

— Калі вы маеце на ўвазе нарыхтоўкі плодаагароднінінай прадукцыі, дык яе якасць. Што можа быць больш важным, чым здароўе? Асабіста я давяраю толькі садавіне, гародніне, якая або вырашчана нашай сям'ёй, або прадаецца ў магазінах. Набываць нешта на трасах ці ў пераходах рызыкоўна: хто і як вырошчваў гэты ўраджай? Што да колькасці, дык гнацца за ёй няма ніякай неабходнасці. Я зарабляю дастаткова, каб набываць патрэбнае па меры неабходнасці. Хоць у маёй сям'і робяцца і ўласныя «закаткі».

**Таццяна МАЛЯЎКА, галоўны спецыяліст аддзела дзяржкантролю за выкарыстаннем і аховай расліннага свету, лясоў і ландшафтаў Мінпрыроды:**

— Гарантыя захоўвання, асабліва, на жаль, некаторай айчыннай прадукцыі. Таму калі нешта набываем, напрыклад, на рынку, дык у невялікіх аб'ёмах. Тыя ж беларускія яблыкі, акрамя позніх гатункаў, рэдка захоўваюцца доўга. Навошта тады марнаваць час, сілы і грошы, калі іх можна набываць пакрысе, па меры неабходнасці, на працягу восені—зімы? Безумоўна, гэта, як правіла, будуць імпартныя яблыкі (можна яшчэ прыгадаць замежныя бульбу і г.д.), але што рабіць? Хацелася б набываць і якасную айчынную прадукцыю...

**Аляксандр МЕЛІХАВЕЦ, начальнік філіяла «Ганцавіцкі райпалівазбыт»:**

— Калі гаварыць пра нашу галіну, дык ніякіх праблем з забеспячэннем насельніцтва палівам няма: ёсць і дровы, і брыкет. Па апошнім мы сваю норму на заводзе да канца не выбіраем. Ведаеце, у апошні час у сувязі з цёплымі зімамі ўзніклі нават цяжкасці са збытам. Давялося абыходзіць літаральна кожнае домаўладанне, нагадваць людзям, каб забралі належныя паліўныя нормы.

**Максім СУМАР, старшыня праўлення Лунінецкага раённага спажывецкага таварыства:**

— Выкананне і перавыкананне паказчыкаў па нарыхтоўках. А яшчэ абавязкова — захаванне таго, што закуплена. З гэтай нагоды мы правялі рамонт усіх сховішчаў, а для капусты, морквы, буракоў сёлета плануем паспець пабудаваць новае сховішча. Хачу сказаць і пра нашу сацыяльную палітыку ў сферы нарыхтовак. Калі СВК заўсёды змогуць рэалізаваць свой ураджай — або прадаць, або перапрацаваць, дык у насельніцтва такая магчымасць ёсць не заўсёды. Таму наша задача — закупіць найперш у грамадзян вынікі іх працы.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

# УВАХОД У ЗААПАРК — БЯСПЛАТНЫ!

**У віцебскім заалагічным парку аб'яўлены тыдзень бясплатнага ўваходу.**

Як паведаміў «Звяздзе» яго дырэктар Аляксей Андрэйкаў, дзеці ва ўзросце да 12 гадоў змогуць на наступным тыдні (з 16 па 21 верасня) не толькі бясплатна ўбачыць звяроў, але і атрымаць падарункі за перамогу ў розных віктарынах, конкурсах.

Супрацоўнікі ўпраўлення ДАІ УУС Віцебскага аблвыканкама будуць уручаць дзятве флікеры, арганізоўваюць розныя конкурсы, у тым ліку і для веласіпедыстаў. Актывісты гарадской арганізацыі БРСМ рыхтуюць жартоўныя віктарыны, прыгатавалі прызы для пераможцаў конкурсу малюнкаў на асфальце. Усе ахвотнікі змогуць фінансава дапамагчы людзям з абмежаванымі магчымасцямі, купіўшы розныя сувеніры, выробленыя іх рукамі.

Усё гэта робіцца дзеля таго, каб адцягнуць увагу дзяцей і падлеткаў ад спакусы ўжывання алкаголю, наркотыкаў, курэння. Зразумела, гэта датычыцца і дарослых. Таксама знаходжанне ў цікавым месцы ўсёй сям'ёй стане добрай прапагандай сямейных каштоўнасцяў, магчымасцяў сямейнага адпачынку з карысцю.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Спорт-тайм

### ПУНЬКО ЗАВАЯВАЎ ДЛЯ БЕЛАРУСІ ТРЭЦЯЕ «ЗОЛАТА»

Трэцяе «золата» для зборнай Беларусі на Паралімпійскіх гульнях у Пекіне заваяваў плывец Сяргей Пунько. Яму не было роўных на дыстанцыі 400 метраў вольным стылем. Беларус устанавіў сусветны рэкорд — 4.08,64. У кітайскай сталіцы Пунько падняўся на п'едэстал гонару ў трэці раз. Раней ён стаў сярэбраным прызёрам на стометроўках брасам і батэрфляем.

Трэцяе «серабро» ў скарбонку зборнай Беларусі на Паралімпіядзе ў Пекіне прынесла Людміла Валчок. Яна вызначылася ў дысцыпліне, якая ўпершыню ўключана ў Гульні — адаптацыйным вяславанні. Здавалася б, спартсменку не павінна здзіўляць яе пазіцыя ў выніковым пратаколе: Людміла — Паралімпійская чэмпіёнка-2006 па лыжных гонках, аднак яна прызнаецца, што не можа паверыць у поспех. «Пакуль не ўсведамляю. Гэта ж спорт, непрадказальнасць. Я вельмі задаволена. І ўдзячная сваім трэнерам. Асабліва Тамары Шыманскай. Яна — трэнер ад Бога». Пасля пяці дзён спаборніцтваў у агульнамедальным заліку роўных сабе не ведаюць гаспадары — 96 узнагарод: 33 залатыя, 37 сярэбраных і 26 бронзавых. Беларусы пакуль на 17-м месцы, маючы 3 «золаты» і 3 «серабры».

### САПЕРНІК «МАЛАДЗЁЖКІ» — ТУРЦЫЯ

Учора ў шведскім Мальме адбылася жараб'ёўка раўнда плэй-оф маладзёжнага чэмпіянату Еўропы-2009. Апошняй перашкодай на шляху нашай маладзёжнай зборнай (И-21) у Швецыю стане каманда Турцыі. У іншых парах сустрэнуцца: Германія — Францыя, Данія — Сербія, Аўстрыя — Фінляндыя, Уэльс — Англія, Італія — Ізраіль і Швейцарыя — Іспанія.

Першы матч са зборнай Турцыі беларуская каманда правядзе 10 ці 11 кастрычніка на полі саперніка, у адказ — 14 ці 15 кастрычніка ў Беларусі. Фінальны турнір пройдзе з 15 па 29 чэрвеня ў Швецыі з удзелам сямі пераможцаў плей-оф і гаспадароў спаборніцтваў.

### «КЕРАМІН» І «ЮНАЦТВА» НАПЕРАДЗЕ

Мінскія «Керамін» і «Юнацтва» лідзіруюць у Адкрытым чэмпіянаце Беларусі па хакеі ў экстралізе. У матчах другога тура «Керамін» адолеў «Брэст» — 4:0. У сваю чаргу «Юнацтва» на выездзе ўзяло верх над наваполацкім «Хімікам -СКА» — 3:1. Вынікі астатніх матчаў наступныя: «Гомель» — «Рыга-2000» — 3:4 (па булітах); «Шыннік» (Бабруйск) — «Нёман» (Гродна) — 2:5; «Металург» (Жлобін») — «Латгале» (Даўгаўпілс) — 8:1; «Віцебск» — «Хімвалакно» (Магілёў) — 1:3. Паядынкі трэцяга тура нацыянальнага першынства пройдуць у нядзелю, 14 верасня.

### У «ДЫНАМА» — ЭКС-ФОРВАРД «АНАХАЙМА»

Мінскае «Дынама» папоўнілася яшчэ адным навічком. Ім стаў 23-гадовы канадзец Джэф Плат, паведамляе афіцыйны сайт КХЛ. Нападаючы правёў пяць матчаў у складзе «Анахайма». За «бела-блакітных» ён будзе выступаць пад 78-м нумарам.

Пасля сібірска-далёкаўсходняга вояжу ў межах чэмпіянату КХЛ мінскае «Дынама» ўчора ўвечары правяло свой першы хатні паядынак. У сталічным Палацы спорту падапечныя Джыма Х'юза памераліся сіламі з мыцішчанскім «Атлантам». На пару з навакузнецкім «Металургам», «Анлант» лідзіруе ў дывізіёне Усевалада Баброва. Абедзве каманды набралі па 10 ачкоў. Следам ідуць уфімскі «Салават Юлаеў» — 9 балаў (пасля 3 паядынкаў), маскоўскі «Спартак» — 5 (4), мінскае «Дынама» — 5 (4) і чарапавецкая «Поўначсталь» — 2 (4).

### ГЛЕБА ПРЫМУСІЛІ ВУЧЫЦЬ ІСПАНСКУЮ

Кіраўніцтва «Барселоны» абавязала навічка каманды Аляксандра Глеба ў максімальна кароткія тэрміны вывучыць іспанскую мову. Паўабаронцу зборнай Беларусі накіравалі на спецыяльныя курсы, дзе ён будзе наведваць заняткі тры разы на тыдзень. Пакуль Глеб адчувае вялікія цяжкасці ў кантактаванні. Футбаліст падпісаў кантракт два месяцы таму, але яму дагэтуль складана разумець заданні галоўнага трэнера Хасэпа Гвардыёлы. Беларусу дапамагае французскі нападаючы Цьеры Анры, з якім ён на працягу двух гадоў выступаў у лонданскім «Арсенале». Кіраўніцтва «Барселоны» лічыць, што Глеб павінен вывучыць іспанскую, каб нармальна кантактаваць не толькі з партнёрамі, але і з трэнерамі і супрацоўнікамі медыцынскай службы каманды. Паводле інфармацыі іспанскага выдання El Mundo Deportivo, паўабаронца зможа разлічваць на пастаяннае месца ў асноўным складзе не раней, чым вывучыць іспанскую.

Ф.СП-1 Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

**АБАНЕМЕНТ** на газету **ЗВЯЗДА** з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання)

Колькасць камплектаў

на 2008 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму
(прозвішча, ініцыялы)
Куды
(адрас)
(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

**ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА** на газету

(індэкс выдання)

ПВ | месца | літар

**ЗВЯЗДА** з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

Кошт: падпіскі ______ руб.; пераадрасоўкі ______ руб. Колькасць камплектаў

на 2008 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму
(прозвішча, ініцыялы)
Куды
(адрас)
(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на IV квартал 2008 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 4 кастрычніка** ў рэдакцыю на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць у якасці прызоў гадзіннікі, майкі, бейсболкі, 7 тэлевізараў «Віцязь» і суперпрыз — халадзільнік. Розыгрыш прызоў праводзіцца **7 кастрычніка 2008 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **да 18 кастрычніка**.

Атрымаць прыз можна ў рэдакцыі **да 20 снежня 2008 г.** пры прад'яўленні квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на IV квартал 2008 года і пашпарта. Дастаўку тэлевізараў і халадзільніка ажыццяўляе рэдакцыя. **Пасля 20 снежня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

**Больш падрабязна правілы гульні «Падпішыся на «Звязду» чытайце ў нумары газеты за 2 верасня 2008 года. Удачы ў гульні!**

Тэрмін правядзення гульні — з 02.09.08 па 18.10.08.

## 2 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на IV квартал 2008 года

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ______________________

______________________

**Падпіска афармлена і аплачана ў** ______________________
(найменне сувязі)

______________________ **на IV кв. 2008 года**

**Хатні адрас і тэлефон** ______________ (індэкс)

______________________

Удачы ў розыгрышы!

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

**ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в г. Марьина Горка Минской области, в том числе:**

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь земельного участка | Начальная цена |
|---|---|---|---|---|
| 2 | г. Марьина Горка, ул. Сиреневая, д. 15 | 624450100001002653 | 0,1096 га | 2 222 962 руб. |
| 3 | г. Марьина Горка, ул. Сиреневая, д. 16 | 624450100001002654 | 0,0997 га | 2 022 165 руб. |
| 4 | г. Марьина Горка, ул. Цветочная, д. 4 | 624450100001002655 | 0,1025 га | 2 078 956 руб. |
| 5 | г. Марьина Горка, ул. Цветочная, д. 6 | 624450100001002651 | 0,1000 га | 2 028 250 руб. |

Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 08.07.2008 г. **Аукцион состоится 30.09.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 321.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 29.09.2008г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 326.

Контактный телефон **(8017) 224 61 34.**
Сайт в интернете: **www.rlt.by.**

УНП 690324015

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 15 (37)

На свае вочы

# МАЛЕНЬКАЯ І ГОРДАЯ

## Суб'ектыўнае адчуванне незалежнасці ў адной балканскай краіне

**Цяпер, калі слова «незалежнасць» гучыць у кожным выпуску навін, прага некаторых народаў да яе выклікае гарачыя спрэчкі, якая незалежнасць мае права на жыццё: тая, што выпакутаваная і палітая слязамі і крывёю, ці тая, якая дасталася людзям мірным шляхам? Навіны з Паўднёвай Асеціі больш зацікаўлена абмяркоўвалі жыхары Чарнагорыі, маленькай краіны, якая два гады таму набыла незалежнасць ад Сербіі. І што асабліва прыкметна — іх развод прайшоў цывілізавана і мірна ў адрозненне ад іншых рэспублік, якія некалі ўтваралі Югаславію. Але наўрад ці гэта неяк паўплывала на братэрскія пачуцці сербаў і чарнагорцаў. Прынамсі, два тыдні ў Чарнагорыі пераканалі мяне ў тым, што межы не перашкаджаюць паразуменню, а народ, які паважае сябе, будзе ставіцца з павагай і да іншых, не забываючыся пра сутнасць братэрства.**

— Браты-беларусы? — вітаў нас хлопец, які рэкламаваў экскурсіі па сваёй краіне. З гонарам распісваў яе вартасці. Ад шматлікіх знаёмых мы чулі пра тое, што Чарнагорыя — краіна-казка на ўзбярэжжы Адрыятыкі. Вырашылі праверыць самі.

Казачнае багацце Чарнагорыі — у колькасці сталіц на душу насельніцтва. У маленькай (каля 700 тысяч жыхароў, прыкладна як у адной нашай Брэсцкай вобласці) Чарнагорыі сталіцай могуць назваць адразу некалькі гарадоў.

Падгорыца — адміністрацыйная сталіца, гэта самы буйны горад краіны, у ім жыве больш за 170 тысяч жыхароў! Наўрад ці западзе гэты горад у сэрца падарожнікаў звычайнай сучаснай архітэктурай. Для турыстаў больш каларытнай здаецца назва горада часоў сацыялізму — Цітаград. Пра тыя часы нагадае вельмі дзіўная чыгунка — аднакалейная, яна пралягала і па раўніне, і не збочвала перад горамі. Спецыяльна для таго, каб Ціта ездзіў па ёй, калі захоча: туды-сюды. І больш ніхто. Горад быў названы так у гонар былога дыктатара Югаславіі. Але вядома, што людзі пасяліліся на гэтым месцы яшчэ ў дарымскія часы. Спакою на гэтай зямлі ў розныя стагоддзі перашкаджалі драматычныя падзеі, якія стойка перажывалі дукляне, братнія сербам мясцовыя насельнікі. У іх горадзе, напрыклад, утульна адчувалі сябе і турэцкія акупанты. Знакі асманскай прысутнасці ёсць у Падгорыцы дагэтуль — мячэці, напрыклад. Славяне, каб застацца нескаронымі, пры наступленні туркаў пайшлі ў Чорныя горы. Адсюль назва краіны яшчэ з XVII стагоддзя. Такім чынам людзі здолелі захаваць сваю чысціню і веру. Ці не падобна на беларусаў: яны не хацелі скарацца туркам, нас Бог бараніў ад мангола-татарскага іга...

Ад Падгорыцы па горным серпанціне мы ехалі ў Астрог, самы знакаміты цудатворны манастыр Чарнагорыі. Белыя сцены, якія літаральна вісяць на гары, былі бачныя здалёк. Але вітая дарога была настолькі вузкай, што без малітвы не пераехаць было немагчыма. «Ніводнай аварыі на гэтым серпанціне ніколі не было», — сказаў кіроўца. Я кінула позірк на драўляны, даволі вялікі крыж, які вісеў перад ім на люстэрку... Ён давёз нас да Ніжняй царквы, а далей па горнай дарозе, якая выцесаная ў скалах, мы падымаліся наверх, да апошняга прыстанку святога Васілія Астрожскага. Паломнікаў (ці турыстаў?) было шмат, якія хацелі патрапіць у келлю, дзе ляжаць мошчы святога. І не меншая чарга стаяла да святой крыніцы. Вада тут прабіваецца скрозь скалы на вышыні каля 1000 метраў над узроўнем мора! Гэта не адзіны цуд Астрога. На маленькім плато было цесна — усе аглядалі вінаградную лазу, якая прарасла літаральна ў скале, а на галінках віселі гронкі вінаграду. На агароджы распяцце — руплівыя рукі мясцовага майстра здолелі ўвасобіць Збавіцеля... з жаночымі формамі. Сімвал пладавітасці, знак таго, што нічога немагчымага няма для Бога.

У гэтай невялікай краіне шмат манастыроў. У Чарнагорыі, як і ў Беларусі, прыкладна каля васьмідзесяці працэнтаў насельніцтва — праваслаўныя. Але ёсць розніца. Бачылі маладых чарнагорцаў і сербаў, якія не хаваюць сваіх нацыяльных крыжыкаў — даволі вялікіх і зусім неабавязкова з каштоўнага металу. Напэўна, ёсць розныя людзі. Але калі казаць пра адчуванне веры ў краіне, то здавалася, што яна ў іх для народа, які здолеў пранесці веру скрозь шматлікія варункі і войны, яна стала асновай маралі. Такія думкі прыходзілі да мяне ў розных сітуацыях, самых прагматычных. Узгадаю камеры для захоўвання рэчаў у супермаркеце — проста крыжы, ні дзверак, ні ключоў. Як пакінуць садавіну, якую набылі на кірмашы? Эксперымент удаўся: усё ляжала на месцы праз паўгадзіны. Ці бутэлька вады — успомнілі пра яе ўжо праз некалькі гадзін, калі моцна захацелася піць у душным горадзе. Крама была ўжо зачынена, але прыбіральшчыца знайшла бутэльку там, дзе яе пакінулі і ветліва падала.

Не ведаю, у якой яшчэ краіне ёсць вуліца пад назвай «Волі Божай»? У чарнагорскім горадзе Цэціне такая ёсць. На аўтобусным прыпынку да групкі падарожнікаў падышоў мясцовы таксіст: куды ехаць? Тлумачым. Ён губляе да нас цікавасць: «Цэціне — маленькі горад, самі ўсё знойдзеце». І адышоў. Наш таксіст у падобнай сітуацыі адразу ж узяў бы ў абарот недасведчаных іншаземцаў, і ўзяў бы па поўнай... Але тады б наўрад ці мы зразумелі, што значыць ісці па «Волі Божай» і жыць па ёй. У нас пра Цэцінскі манастыр ведаюць з таго часу, як летась прывозілі ў Мінск дзясніцу Іаана Хрысціцеля, якая захоўваецца ў Чарнагорыі побач з мошчамі святога Пятра Цэціньскага. Гэты манастыр дзейнічае, таму пры ўваходзе на яго тэрыторыю трэба думаць пра дрэс-код. Але і пра несвядомых праваслаўных тут паклапаціліся: прапаноўваюць апрануць доўгія закрытыя сарочкі. За парадкам у царкве назіраў даволі малады манах Дзіямід. Дазволіў без мітусні прыкласціся да святыні, удумліва памаліцца. А калі пачуў, што паломнікі з Беларусі, радасці не хаваў: «О, памятаю, колькі людзей прыходзіла ў вас да дзясніцы! А Мінск — такі вялікі горад, сапраўдная сталіца!..»



**(Заканчэнне на 8-й стар.)**

Кантакты

## Шэсць канцэртаў польскага маэстра

**Ужо не першы год працягваецца актыўнае творчае супрацоўніцтва сімфанічнага аркестра Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Беларусі з галоўным дырыжорам Зялёнагурскай філармоніі імя Тадэвуша Байрда (Польшча), прафесарам Чэславам Грабоўскім.**

Беларускія аматары музыкі памятаюць цудоўныя канцэрты сімфанічнага аркестра пад яго кіраўніцтвам у залах філармоніі ў Мінску і Сафійскага сабора ў Полацку. У сваю чаргу публіцы запомніліся выступленні аркестра з удзелам лаўрэата міжнародных конкурсаў скрыпача Арцёма Шышкова сёлета ў сакавіку ў польскіх гарадах Сулехове і Зялёнай Гуры, асабліва цёпла былі ўспрыняты ў выкананні аркестра творы С. Манюшкі, П. Чайкоўскага і А. Дворжака.

Як паведаміла прэс-служба беларускага пасольства ў Варшаве, з лістапада 2008 па лістапад 2009 года ў залах Беларусі запланаваны шэсць канцэртаў з удзелам сімфанічнага аркестра Белтэлерадыёкампаніі пад кіраўніцтвам Ч. Грабоўскага. Першы канцэрт адбудзецца напрыканцы лістапада ў мінскім Палацы культуры прафсаюзаў з удзелам польскіх салістаў.

**Леанід ТУГАРЫН.**

## Бібліёбус як альтэрнатыва бібліятэцы

### Але толькі ў маланаселеных і аддаленых пунктах

**Сёння па краіне ездзяць 38 бібліёбусаў, якія дапамагаюць наладзіць бібліятэчнае абслугоўванне там, дзе яго няма, ці бібліятэка перастала існаваць. Пра гэта паведаміў на прэс-канферэнцыі намеснік Міністра культуры Беларусі Віктар Кураш.**

У краіне ўжо было скасавана 76 бібліятэк як неперспектыўныя ў аддаленых населеных пунктах. На 33 бібліятэкі менш стала сёлета. Скасаванне бібліятэк адбываецца як вынік сацыяльных і дэмаграфічных праблем, якія існуюць у Беларусі. Але не толькі — увесь свет, які ўмее лічыць грошы, зразумеў карысць бібліёбусаў, якія вязуць культуру людзям. Такі від абслугоўвання апрабаваны ў развітой Еўропе. І прыжываецца ў нас: людзі могуць нават заказаць, што ім прывесці наступным разам.

— Бібліятэчны фонд Беларусі складаецца з больш чым 200 мільёнаў адзінак, — адзначыў Віктар Кураш. — 15 працэнтаў ад бюджэтнага фінансавання бібліятэк павінна ісці на набыццё новай літаратуры. Але за сем месяцаў 2008 года на гэтыя патрэбы пайшло 18 працэнтаў па рэспубліцы. Нам яшчэ ёсць куды імкнуцца: мы пакуль не дацягваем да еўрапейскіх паказчыкаў, калі 250 кніг прыпадае на 1000 насельніцтва. Стаіць перад намі задача падключыць усе бібліятэкі да сеткі інтэрнэту.

Сёння з прымяненнем найноўшых інфармацыйных тэхналогій ужо працуюць не толькі буйнейшыя бібліятэкі краіны, але і цэнтральныя гарадскія і раённыя бібліятэкі, куды таксама прыйшоў інтэрнэт. Трыумфальнае прышэсце інтэрнэт-цывілізацыі павінна дасягнуць бібліятэк аграгарадкоў і вёсак.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

Дзень горада: дзеючыя асобы

# ТЭАТР ДЛЯ НЕЗВЫЧАЙНАГА ГЛЕДАЧА

**Вогненнае шоу, трукі на хадулях і яркі грым — хутчэй, цыркавыя элементы? Для эксперыментальнага тэатра «Eye», якім кіруе Дзмітрый Масцяніца, гэта толькі маленькія дэталі ў стварэнні пэўнага сюжэта.**

7 гадоў таму Дзмітрый Масцяніца проста рабіў перфомансы пад музыку. А калі зразумеў, што выступаць пад адну і тую ж музыку з рознымі перфомансамі не надта цікава, вырашыў падзяліць тэатр і музыку. Спачатку «І»(я) задумваўся як сольны праект, але хутка ў яго пачалі прыходзіць новыя людзі. Сугучнасць спадабалася акцёрам, і яны вырашылі знайсці іншае слова. Так і атрымалася «ЕYE» (вока), а ў працэсе стварэння пабудаваўся погляд акцёраў на свет, які і зараз яны дэманструюць гледачу праз рухі цела.

Дарэчы, Тэатр Дзмітрыя Масцяніцы не адзіны ў краіне. Найбліжэйшы яго аналаг — тэатр Вячаслава Іназемцава «Інжэст», які старэйшы за «Eye» роўна на 20 гадоў. На жаль, «выжыць» нестандартным калектывам вельмі складана. Перыядычна яны з'яўляюцца, але пераўтвараюцца ў нешта забаўляльнае, ці проста распадаюцца.



Пластычны тэатр — з'ява ў нашай краіне рэдкая, таму і цікавая. Самая простая расшыфроўка пластычнага тэатра — тэатр без слоў. Гэта не азначае, што мова зусім не выкарыстоўваецца ў спектаклях. Калі кантэкст гэтага патрабуе, акцёры смела размаўляюць, але, як правіла, гэта бывае вельмі рэдка. У асноўным жа ў пастаноўках выкарыстоўваюцца толькі рухі цела. Чым жа тады пластычны тэатр адрозніваецца ад, скажам, танцавальнага? Першасным у танцы з'яўляецца рух, рытмічнасць. А ў эксперыментальным тэатры «Eye» галоўнае — стан чалавека, які выказваецца пры дапамозе пластыкі.

Найчасцей акцёраў тэатра «Eye» можна сустрэць у клубе «Графіці». Там, па словах Дзмітрыя Масцяніцы, адбываюцца самыя першыя эксперыментальныя пастаноўкі, з усімі іх промахамі і падзеннямі. Публіка ў клубе збіраецца творчая, таму акцёры не баяцца зрабіць памылку, каб потым больш яе не паўтараць на больш маштабных мерапрыемствах. Асноўны склад трупы — прыкладна 11 чалавек. Вялікія спектаклі эксперыментальны тэатр ставіць дастаткова рэдка. Пакуль што такіх пастановак дзве — «Insomnia»(бяссонніца) і «З ВЕРЬ». У асноўным жа акцёры ставяць мініяцюры, працуюць у клубах, на выставах, карпаратывах. Тэатр дастаткова запатрабаваны. У апошні час пастаноўкі пачалі заказваць нават на сямейныя святы, вяселлі. Гэта даказвае тое, што публіка «дарасла» да пластычнага тэатра, яна разумее яго і цікавіцца ім.



— Пачыналі мы з таго, што спрабавалі здзівіць гледача нейкімі экстрэмальнымі фізічнымі рэчамі, — расказвае Дзмітрый Масцяніца. — Да прыкладу, акцёр мог... укусіць гледача за нагу, ці выліць на яго шклянку малака. І спачатку людзі добра да гэтага ставіліся. Але потым мы зразумелі, што кантакт такога кшталту падабаецца не ўсім. Цяпер мы працуем, хутчэй, з унутраным экстрэмальным станам. Дадаём нейкія сітуацыі, якія б «чаплялі» гледача знутры. Экстрым зараз мы бачым у гэтым. Акрамя таго, насамрэч любім працаваць з публікай. Па сталах хадзіць, пад столлю вісець... Дабаўляем нейкія маленькія элементы, каб глядач адчуваў сябе ўцягнутым у нашу пастаноўку. Мы, дарэчы, таму і называемся эксперыментальным тэатрам. Аснова нашай жыццядзейнасці ў тым, што мы не абмяжоўваемся нейкім адным метадам, пастаянна знаходзімся ў пошуку нечага незвычайнага.

Тэатр «Eye» часцей за ўсё працуе ў Мінску. Гэта звязана перш за ўсё з тэхнічнымі момантамі: як правіла, запрашаюць выязджаць з піратэхнікай. А гэта вельмі дорага і непрактычна. І ўсё ж акцёры выступаюць не толькі ў беларускіх гарадах, але і за межамі нашай краіны. Іх творчасць карыстаецца попытам сярод гледачоў.

Тым не менш, эксперыментальны пластычны тэатр «Eye» — гэта, хутчэй, экзотыка для беларускага гледача. Таму не дзіва, што пакуль яго пастаноўкі разумеюць далёка не ўсе. Акцёры самі ведаюць пра гэта і звычайна выбіраюць месцы для сваіх пастановак, даведваюцца ў арганізатараў пра дапушчальнасць нейкіх элементаў выступлення.

На кожнага акцёра заўсёды знойдзецца свой глядач. Нават такі ж незвычайны і экстрэмальны, як спектаклі пластычнага тэатра «Eye».

**P.S. У бліжэйшы час выступленне тэатра можна будзе пабачыць на святкаванні дня горада Мінска, каля Палаца чыгуначнікаў (пляцоўка Кастрычніцкага раёна).**

**Таццяна КАВАЛЁВА.**
**Фота з архіва Дзмітрыя МАСЦЯНІЦЫ.**

# За гарамі, за лясамі

Бяседныя песні

«Час імклівы. У шумнай хуткаплыннасці падзей мы не заўважаем, што сваё жыццё разменьваем на драбязу, на мізэрныя справы», — папярэджвае нас крыху тужлівая песня «За гарамі, за лясамі». Таму і гучыць яна на бяседзе, падсумоўваючы ўжо выказанае ці задаючы тэму для новых расповедаў-споведзяў.

Песня мае тэкставыя варыянты і іншыя назвы («Гады маладыя», «Галубы»; звычайна ў народзе называюць па першым радку). Але заўсёды згадваюцца галубы — у народным уяўленні боскія птушкі, якія нясуць чысціню, спакой, веру ў светлую будучыню. Упамінаецца і кляновы мост — сувязь паміж мінуўшчынай і сучаснасцю. На Палессі спяваюць «лета маладыя» (замест «годы маладыя»), каб і ў песні пазначыць пра спрадвечнасць быццёвых клопатаў і яшчэ раз паведаміць пра той адметны гадавы перыяд, калі больш за ўсё пралятае час у пачуццёвым напружанні, жарсцях, марных залётах.

**Беларуская народная песня**

*За гарамі, за лясамі*
*Галубы лятаюць.*
*Непрыкметна, непрыкметна*
*Годы пралятаюць.*
*Запрагу я, запрагу я*
*Коні вараныя*
*Дый паеду даганяці*
*Годы маладыя.*
*Як дагнаў я свае годы*
*На кляновым мосце.*
*— Вярніцеся, мае годы,*
*Да мяне ў госці.*
*— Не вернемся, не вернемся*
*Да цябе ў госці:*
*Трэба было шанаваць нас*
*Дый з маладосці...*

Апошнія два радкі кожнай страфы паўтараюцца.

**Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН.**

### ДЗЕ Ў МІНСКУ З'ЯВІЎСЯ ЯШЧЭ АДЗІН КВЕТКАВЫ ГАДЗІННІК

даведацца зможа кожны, хто будзе прагульвацца ў раёне дыспетчарскай станцыі «Дружная» побач з перакрыжаваннем вуліцы Вакзальнай з вуліцай Талстога. Год таму кветкавы гадзіннік завялі каля гарадской ратушы.

**«Мінск—Навіны».**

# «А ХТО ТАМ ІДЗЕ?» прагучыць у Дзень горада

## Адчуць словы верша па-новаму можна будзе ў Дзяржаўным літаратурным музеі імя Янкі Купалы.

**13 верасня ў музеі можна будзе цікава правесці дзень, які павольна пяройдзе ў культурную ноч. Сваю «ноч музея» тут адзначаць сумесным праектам «Museum», які аб'ядноае рознамаштабныя і рознажанравыя тэатральна-канцэртныя мерапрыемствы з удзелам маладых артыстаў, музыкантаў, мастакоў.**

Усё пачнецца а 16-й гадзіне акцыяй «Рок на палатне». Музыка, якая расцякаецца фарбамі... Такое можа быць у рэальным часе і з рэальнымі людзьмі. Рэальныя музыканты будуць граць рок-музыку, а рэальныя мастакі тут жа будуць яе маляваць. Натхняць мастакоў на эмоцыі і творы пагадзіліся музыканты трох гуртоў: «Zombie Zoo», «Generation-fi», «Пленэр». Музыкантам, вядома ж, працей — адыгралі сваё, пазабаўлялі публіку і самі могуць далучыцца да прагляду таго, што атрымалася ў мастакоў. А ім, за тое, што атрымаецца, магчыма, усё жыццё адказваць давядзецца — усё-такі творы. Пры тым, што яны маладыя і толькі пачынаюць. Але хто ведае, магчыма іх аўтографы калі-небудзь будуць значыцца пад творамі ў лепшых музеях. Вось іх імёны: Ксенія Васкрасенская, Мікола Даўнар, Зміцер Буко, Захар Кудзін, Аляксандр Лаўрэнчыкаў.

Бліжэй да ночы час пазнаёміцца з «Праектам шчырай музыкі». Ён пачнецца а 19-й гадзіне. Шчыра — гэта калі зразумела і блізка. Радуюць зразумелыя назвы ўдзельнікаў: «Адным днём», «Harotnica», «Маланка Orchestra», «NHS-Ethno». Але мы ж цывілізаваныя людзі і хочам быць зразумелыя іншым. Напрыклад, гасцям горада. І вось тут падрыхтаваны самы галоўны сюрпрыз ад акцёраў тэатра «Кампанія»: верш Янкі Купалы «А хто там ідзе?» на васьмі мовах! А ці самі мы яго добра памятаем?

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

На конкурс апавяданняў

**Як гавораць, хочаш жыць — умей круціцца. І кру́ціцца, кру́ціцца вёска і яе людзі. Каб жыць не толькі як набяжыць, а трошкі яшчэ і лепей. Пра гэта расказвае нам Уладзімір Цішуроў з вёскі Навапруддзе Круглянскага раёна — непрыгладжана, жорстка. Як яно ёсць.**

**Віктар КАЗЬКО.**

Уладзімір ЦІШУРОЎ

# «БАНЫЧЬКА» МЁДУ

Бова Летакоў пазнаёміўся з Генікам Палюдам выпадкова ў калгасным кароўніку падчас вячэрняй дойкі. Тэлефоны ў вёсцы з прычыны павышанай вільготнасці маўчалі, а вось на ферме працаваў. Туды і пайшоў Бова, каб патэлефанаваць жонцы ў райцэнтр. У маленстве яго звалі Вова, але мяккая літара «в» зусім не пасавала яго, як казалі, «зялезнаму» характару, таму й звалі за вочы Бова. Меў у гэтай аддаленай ад райцэнтра вёсцы дворышча, якое купіў за капейкі. Гэта быў высокі, кастлявы рыжаваты мужчына. Чырвань на шчоках, нягледзячы на пенсійны ўзрост, была юначая. Ды й хадня была зусім не пенсіянерская, юначая. Меў у райцэнтры трохпакаёўку, але ўвесну, улетку, чапляючы не адзін тыдзень восені, гаспадарыў на «даче», трымаў пасеку. Маючы беларускія карані, гаварыў чыста па-руску, «трасся».

Хударлявы, чарнявы, вечна нечым прыгнечаны Генік Палюда быў ахрышчаны вяскоўцамі гаротнікам. Жыў бабылём, сталай работы не меў, працаваў, як кажуць, па людзях — адпаведна свайму прозвішчу. Назва вёскі, дзе жыў — Палюддзе, — таксама настройвала на такі лад жыцця. Хтось запросіць гной выкінуць, хтось — дровы пакалоць. Выкідвае, коле, вядома ж, за плату. Тым і жыў. У вёску, дзе летаваў Бова, Генік прычэпаў да радні. Яе дома не аказалася, і ён прайшоў на ферму папытаць дарак, мо, бачылі. Генік нечым прыцягнуў увагу Летакова і той пасля двух пытанняў (Дзе працуеш? Што маеш?) запрасіў на летнік «дельно поговорить».

Хата-летнік Летакова была старая, прыземістая, як прывід былых стагоддзяў беларускай вёскі. Праўда, са знакамі касметычнага рамонту ўжо XXI стагоддзя. І ў двары, і ў хаце была казарменная чысціня і парадак. У хаце пуста і цёпла. Летакоў за дзве хвіліны накрыў стол. На талерках красавалася парэзаная ружовая каўбаса, марынаваныя грыбы, салянка з капусты. Апошнім жэстам гасціннасці была бутэлька віна з назвай «Вишневая шаль». Гаспадар, ставячы яе, стукнуў донцам аб стол, той аж кракрануў.

— Я, ведаеш, такую гадасць не п'ю, — наліўшы па чарцы, сказаў Летакоў. — Ну, а раз я цябе запрасіў, то вып'ю, а ўжо ж не памрэм!.. Ну, давай!

Амаль адначасова — выпілі. Гаспадар без ахвоты закусваў, Генік меў ахвоту і добра закусіць, але каб не выглядаць непрыстойна, стрымліваўся.

— Дык ты кажаш, гэтак і перабіваешся з вады на квас?! — вёў гаворку Бова. — Перабіваешся, і ўсё... Та-ак, а жыць трэба ўмець, братка-кролік... Ты вось паглядзі на мяне! Мне шэсцьдзесят, а бачыш, які я?

— Трэба ўмець жыць, Генка! А то ты жывеш? У цябе дзеці ёсць? Няма? Ну вось бачыш! А чаму ў цябе няма дзяцей? Ня змог?..

Генік памкнуўся быў нешта сказаць, але Бова вёў сваё.

— Чакай, ты сваё потым скажаш. У мяне — трое дзяцей. Сын, дзве дачкі! Я не толькі, як кажуць, сатварыў іх і паставіў на ногі! Галоўнае, — гаспадар узняў уверх указальны палец, — вывучыў, вывеў у людзі! Ты слухай, не перабівай!

— М-гы, слухаю.

— Я ж не хто-небудзь, я ж — бацька! У-га, я ўсё бачу, усё знаю! Гена, скажы мне чэсна, ты хочаш стаць багатым? Ну-у, мець харошы дом, займець бабу?

— Яно б няплоха...

— А ты ведаеш, чаго я такі здаро-вы? — Бова выпнуў плоскія грудзі. — Усё з мёду. Ем мёд — вось і такі здаровы, дужы! Ты ведаеш, дзе ў мяне нявестка працуе?

— Не-а.

— Табе там ніколі не быць, не працаваць!.. Яна аграном па спецыяльнасці. Прыехала ў наш гарадок, туды-сюды, дыплом ёсць, падхадзяшчай работы — няма! Няма і ўсё, хоць ты што хочаш! Кругом — беспрацоўе! А ў калгас, у вёску яна не хоча. Не хоча і ўсё, хоць ты яе забі... Я жартую... Пайшоў да аднаго начальніка. Так і так, кажу, вазьмі нявестку на работу... Ён нешта мыліўся, мыліўся — ладна, кажа, падумаю... Я яму трохлітровы слоік мёду — торк! Узяў... Добра, кажа, падыдзіце паслязаўтра. Званю паслязаўтра — усё-о-о, работа ёсць! Сядзіць цяпер у кабінеце, паперкі там перакладае... Але ж яна лічыцца спецыялістам! Звыш паўмільёна ў кішэні. Трэба ўмець з людзьмі ладзіць. Я ўсё ба-чу... Добра, давай вып'ем!

Летакоў зноў напоўніў вінoм дзве чаркі. Моўчкі выпілі. Палюда чапляў на відэлец па два кавалкі каўбасы. Гаспадар глядзеў на гэта, нібыта на ім завіс слон.

— Дык вось, слухай далей — не перабівай! Сын, значыць, у мяне ёсць. Увесь па матцы, па маёй жонцы — поўны такі, пухлы, я ж, бачыш, худы, жылісты, а ён поўны! Ён у мяне таксама на агранома аконччыў. ВУЗ! Ты ведаеш, што такое ВУЗ?

— Знаю. Гэта — вусы...

— Ха-ха-ха! Ну ты даеш!.. Х-ха. Гэта, дарагі ты мой, «высшее учебное заведение», паняў? Паняў. Харашо. Слухай далей. Сыну таксама трэба была работа. У вёску не захацеў. Ну гэта яго справа. Аднак жа дзеці нарадзіліся, а ў бацькі работы няма. Пайшоў я да аднаго начальніка ў нашым гарадку. Так і так, кажу, трэба сына прыстроіць. Нет мест, кажа. Як гэта так? А вось так, няма і ўсё. Карацей, раз пабяседаваў, другі, прынёс банычьку мёду, тры літры. Усё! Дзела ўладзілася! Дзе, ты думаеш, мой сын працуе? Ён інжынер па Тэбе! Знаеш, што гэта такое?

— Трудная бухгалцерыя...

— Дурак ты, Гена, гэта тэхніка бяспекі на вытворчасці. А ён — інжынер. А вучыўся на агранома... Калі ўжо па праўдзе, дык я і мая жонка там жа працуем, пчалярамі. Начальнік рашыў займець пасеку. Што ж, чым плоха?

— Нічым няплоха...

— Усё роўна ты, Гена, адсталы чалавек! Гаротнік і ўсё. Не крыўдуй. Тут ужо, гляджу, няма чаго налівaць, — Бова паглядзеў на бутэльку, — ну, добра... Дык пра што гэта я?.. Ты вось скажы мне, Геній, бачыш, цябе кім назваў! Скажы, ты хочаш нармальна жыць? Хочаш, я цябе зраблю багатым, заможным? Што маўчыш? Маўчанне — знак згоды!.. А дзеці мае ўсім забяспечаны. Старэйшая мая дачка дзе, ты думаеш, жыве? Яна жыве ў Піцеры! Знаеш такі горад? Знаеш, геаграфію ў школе прахадзіў...

— Мы-га...

— Яна, дачка мая, галоўны эканаміст на піцерскай біржы, там, па закупцы тавару з-за мяжы, разумееш?

— Ага.

— Вось так! Яна ў мяне забірае ў Піцер паўтоны мёду! Разумееш, паўтоны! — Летакоў узняў указальны палец, у накірунку ўцямнелых, векавых дошак столі, а мо і вышэй, у неба. Ці да яго там, на небе, Бовінага бога, які так спрыяў у сямейных справах.

Але Генку ўяўлялася, што там, за столлю — Піцер, а ў ім дачка пчаляра ў раскошным гранітна-мармуровым, светлых тонаў палацы. Сядзіць, як царыца, усміхаецца. І ён засмяяўся.

— Не, гэта я не так... Гэта я так задумаўся...

Бова з паўхвіліны падазрона глядзеў на Палюду.

— Адзінокі ты чалавек, Гена, мне цябе шкода... Вось і загаворвацца стаў... Ну што зробіш? Бывае, — крыху памаўчаў. — Жонка ў мяне жанчына прыстойная, граматная. Сацыяльна актыўная пенсіянерка! Паняў?

— Паняў...

— Нічога ты не паняў... Калі б панімаў, дык так бы не жыў. Жонка мая восем гадоў, на пенсію выйшаўшы, работала. Банычьку мёду занясу куды трэба — кантракт падпісаны, працуй! І пенсію атрымлівала, і заробак... Вось так трэба жыць. Не, ну ты мне скажы, ты хочаш быць багатым?

— Хачу.

Талерка з каўбасой паказала лысае дно. Паружавелы твар Геніка нагадваў свежы вугальчык.

— Паслухайце, а колькі гэта вы аддалі мёду, каб жонка ваша мела працу? — нясмела з заіканнем спытаў.

— Ну колькі? Там яно... падлікам не займаўся, ды, брац-це, н-нямала.

— А г-гэта, а каб дачка выўчылася на эканаміста?

— Абы-што пытаешся!.. Хто яго лічыў! Ну, многа, можа, і паўтоны.

— А каб сын быў пры раб-боце?

— Гена, якое тваё дзела? Ты слухай мяне!..

— Дзела-то яно дзела... Яно то да-а... А я калі мёду не маю, дык, мусіць, так і пражыву тут, без сур'ёзнай работы? Га?

— Сур'ёзнай работы, сур'ёзнай работы... Так! Значыць так! З заўтрашняга дня пачнём! Я цябе чалавекам зраблю! Там, каля твайго двара, поле ёсць? Ёсць! Рапс цвісці будзе! Гэта харашо! Пастаўлю домікі, будзеш глядзець, а з табой буду разлічвацца...

— А як?

— Ну як-як? Банычьку мёду дам... Потым, можа, пчаліную сям'ю, яна разраіцца — будзеш дзве мець! Потым з дзвюх — чатыры! І дзела пойдзе!

— У-у-у, калі тое будзе?.. — Генікавае працяглае «у-у-у-у» нагадала Бову выццё ваўка ў Піліпаўку на краі лесу.

— Што?

— Пайду я дамоў, — Генік сытазадаволена падняўся з табурэта. Бачна было, што вячэра яму спадабалася больш, чым прапанова Летакова «забогатеть».

І ён знік з вачэй, як начная птушка-кажан.

— Дурань, адным словам, — і Летакоў стаў прыбіраць са стала пустыя талеркі.

*Круглянскі раён.*

ФАРМАТнём

# Самурай — не джэдай, або Смяротныя гульні ад суму

**З 18 па 21 верасня ў сталічных кінатэатрах «Аўрора», «Мір», «Перамога», «Цэнтральны» пройдзе чарговы эксклюзіўны паказ фільмаў праекта «КІНАфармат 4 х 4».**

Новая драматычная камедыя **«Містэр Адзіноцтва»** створаная кінамайстрамі Вялікабрытаніі, Францыі, ЗША і Ірландыі. Аўтары сцэнарыя — Хармані Корын і Аві Корын, рэжысёр-пастаноўшчык — Хармані Корын.



У цэнтры кінааповеду жыццё акцёраў-двайнікоў, якія зарабляюць на жыццё сваім падабенствам са знакамітасцямі. Уцёкі ад адзіноцтва, ад шуму гарадоў прыводзяць іх у цудоўны і па-казачнаму шыкоўны замак. Там шумна, весела, прыгожа, можна займацца ўсім, чым хочаш. Але нават унутры гэтай ідыліі праяўляюцца боль і пакуты. Яны вяртаюць усё на свае месцы, у рэальнасць, але пры гэтым усё роўна не ведаеш, хто ты насамрэч...

У фільме здымаліся Дыега Луна, Саманта Мортан, Дэні Лаван, Джэймс Фокс, Аніта Паленберг. Карціна з поспехам была паказана на МФК у Канах, Карлавых Варах, Мельбурне, Таронта, Капенгагене, Стакгольме, Варшаве, Бруселі, Лондане.

З цікавасцю глядзіцца таксама новы трылер **«Забаўныя гульні»** сумеснай вытворчасці ЗША, Францыі, Вялікабрытаніі, Аўстрыі, Германіі і Італіі. Пастаноўку карціны паводле свайго сцэнарыя ажыццявіў рэжысёр Міхаэль Ханеке.



Двое ветлівых маладых людзей прыходзяць у дом буржуазнай пары з нявіннай суседскай просьбай, а калі яна задаволена, то не спяшаюцца сыходзіць. Больш за тое, юнакі прапаноўваюць гаспадарам паспрачацца... ці дажывуць тыя да раніцы.

У ролях: Наомі Уотс, Цім Рот, Майкл Піт, Брэйдзі Корбет, Дэван Герхард.

Прэм'ерны паказ карціны адбыўся на МФК у Лондане, Бруселі і Даніі.

Кінамайстрамі Японіі створаны баявік **«Сукіясі вестэрн Джанга»**. Яго паставіў паводле свайго сцэнарыя, напісанага ў сааўтарстве з Мока Накамурай, рэжысёр Такашы Міке. Назва карціны адсылае да фільма італьянскага рэжысёра Серджа Карбучы «Джанга», знятага ў 1966 годзе ў жанры спагет-вестэрна.

У невялікай японскай вёсачцы пачынаецца залатая ліхаманка. Барацьба за золата дзеліць усіх жыхароў на дзве групы. Але раптоўна ў вёсцы з'яўляецца загадкавы вандроўнік, ён называе сябе вольнанаёмным воінам і прапаноўвае сваё выдатнае майстэрства стральбы таму, хто больш заплаціць.



У фільме здымаліся Каоры Мамоі, Хідэакі Іта, Коічы Сата, Квенцін Таранціна, Масанобу Анда.

Карціна намінавалася на самую прэстыжную міжнародную кінаўзнагароду «Залаты Леў».

У Японіі зняты і новы фільм жахаў **«Кайдан»**. Гэта экранізацыя японскай літаратуры жахаў XIX стагоддзя. Пастаноўку карціны ажыццявіў рэжысёр Хідэа Наката.



250 гадоў таму. Соэцу, дробны ліхвяр, забіты жорсткім самураем Сіндзаэмонам і скінуты ў Касанэ-га-фуці — вір крутой ракі, дзе, згодна з легендай, той, хто ўпадзе ў ваду, ніколі зноў не ўсплыве на паверхню. Праз гады юны сын самурая Сінкіці закахаўся ў немаладую ўжо дачку ліхвяра Тоёсігу, яна адказа яму ўзаемнасцю. Але іх шчасце было нядоўгае. Тоёсіга нечакана памірае ад дзіўнай хваробы, а Сінкіці вымушаны пdescribed глядзець у твар страшнай праўдзе, якую захоўвае Касанэ-га-фуці.

У фільме здымаліся Куміко Асо, Такакі Энокі, Рэона Хірота, Міе Сузукіэ, Тэй Кімура.

**Раман КОСЦІН.**

Вытворчыя драмы

# КАБ МЫЛІЛАСЯ І ПЕНІЛАСЯ,

## альбо Ці здолее ААТ «Бархім» пацiснуць на рынку вядомую карпарацыю «Проктэр энд Гэмбл»?

**У Баранавічах на ААТ «Бархім» прайшла нарада на якой была разгледжана сітуацыя, што склалася на прадпрыемстве.**

**Нарада праводзілася камітэтам Дзяржкантролю Беларусі (КДК), у яе рабоце ўзялі ўдзел старшыня Зянон Ломаць і шэраг высокапастаўленых прадстаўнікоў зацікаўленых органаў дзяржаўнага кіравання: Міністэрства гандлю, Дзяржкамітэта па стандартызацыі, канцэрна «Белнафтахім»...**

**Дзяржкантроль праводзіць мэтанакіраваную работу на зніжэнне неабгрунтаваных імпартных паставак у краіну, і ААТ «Бархім» трапіў у поле зроку КДК невыпадкова.**

На сёння ў нашу краіну завозіцца 80 працэнтаў сінтэтычных мыйных сродкаў (СМС), а «Бархім» выпускае толькі 6,4 працэнта СМС ад патрэбнасці краіны. Акрамя гэтага, за апошнія гады доля продажу айчыннай прадукцыі, якую выпускае «Бархім», зніжаецца.

На прадпрыемстве склалася няпростая сітуацыя: вытворчыя магутнасці загружаны не поўнасцю (крыху больш за палову), ёсць нараканні з боку гандлёвых прадпрыемстваў на якасць прадукцыі і ўпакоўкі, пасіўная маркетынгавая палітыка...

Выстаяць пры засіллі імпартных мыйных сродкаў «Бархіму» надзвычай складана. Але такая сітуацыя ўзнікла не сёння, а міна замаруджанага дзеяння была на прадпрыемстве закладзеная падчас распаду Саюза.

У артыкуле «Мутная кава» наша газета расказвала, чым займалася тагачаснае кіраўніцтва на хімзаводзе. Напомню.

Узяўшы валютны крэдыт прадпрыемства закупіла за мяжой на дзесяткі тысяч дойчмарак пратэрмінаваную каву, і тыя тоны кавы прадавалі некаторыя спецыялісты прадпрыемства, замест таго, каб падумаць пра вытворчасць, пра тое, як выжыць у складаных умовах. Завод ператварыўся ў нейкую паўлегальную камерцыйную структуру, і ад такой дзейнасці прадпрыемства не мела ніякай выгады. Нехта ж на гэтых аперацыях штосьці і зарабіў, а інакш для чаго гэта рабілася?

Пры любым зручным выпадку я прыводжу, як прыклад, дзеянні старшыні СВК «Ляхавіцкі» А. Вітко: як толькі ўзнікла неразбярыха, ён пачаў закупляць тэхніку. Заваліў склады запчасткамі, маторамі, агрэгатамі... а як пачалася інфляцыя, перажыў яе лягчэй, чым тыя, хто ўжо калгасную тэхніку пускаў «налева». І сёння «Ляхавіцкі» — адна з вядучых у вобласці гаспадарак.

А «Бархім» ішоў да цяперашніх праблем крок за крокам. Гэта папершае, а з другога боку, не трэба забываць пра рынак з яго законамі.

Калі ў нас прадаецца 80 працэнтаў імпартных мыйных сродкаў, то нехта ж зацікаўлены, каб Беларусь і надалей была насычана імі. Можна не сумнявацца, што гэтыя «нехта» — асобы ўплывовыя і беларускі рынак яны не аддадуць на карысць прадукцыі «Бархіма» без процістаяння.

— Ёсць людзі, якія лабіруюць пытанні імпарту і ў нас, такія прыклады ведаем, — пагадзіўся старшыня Дзяржкантролю З. Ломаць і прывёў сітуацыю з соладам, калі давялося даказваць, што наш не саступае імпартнаму.

Каб дапамагчы «Бархіму», прадпрыемства далучылі да канцэрна «Белнафтахім» і гэта дало магчымасць крыху выправіць становішча — часткова мадэрнізаваць вытворчасць.

Але аб чым ішла гаворка на нарадзе?

Пасля выступлення дырэктара «Бархіма» Яўгена Рудога перад ім было пастаўлена многа пытанняў.

— Працаваць, калі ёсць попыт на прадукцыю, неабходна круглыя суткі, а яшчэ здзіўляе той факт, што калі па якасці прадукцыя «Бархіма» дасягае 80 працэнтаў імпартнай, то чаму яна прадаецца ў двары разы танней за імпартную? А як у такім разе будуць аддавацца сродкі, узятыя ў канцэрна? — спытаў намеснік старшыні Дзяржкантролю Аляксандр Агееў.

І хоць аб'ём рэалізацыі на прадпрыемстве павялічыўся на 168 працэнтаў, усё ж вярнуць канцэрну мільярды будзе нялёгка. Дарэчы, інвестыцыі ў 2007 годзе ў параўнанні з 2006 годам на «Бархіме» дасягнулі 340 працэнтаў і заслуга тут канцэрна «Белнафтахім», які толькі летась уклаў у прадпрыемства 7 млрд рублёў.

Дырэктар «Бархіма» наракаў на невысокую якасць упакоўкі і спадзяваўся, што новае абсталяванне дасць магчымасць выправіць гэты недахоп. Маўляў, пакуль па знешнім выглядзе прадукцыя прайграе замежнай, то цяжка канкурыраваць.

— Можна гаварыць пра якасць кардону, як і ўпакоўкі ў цэлым, але ж у першую чаргу спажыўцам патрэбна якасць парашкоў, і на гэтым неабходна сканцэнтраваць увагу, — адзначыў З. Ломаць.

Сёння пакупніка прыгожай упакоўкай не абдурыш. У дзевяностыя гады, сапраўды, пакупнік кідаўся на тавар, загорнуты ў бліскучую паперу, а цяпер стаўленне змянілася. Спажывец хоча ўсё «паспрабаваць на «зуб». І калі нешта людзям прыйдзецца даспадобы, то іх ужо ніякая рэклама не саб'е з панталыку.

Гаварылі выступоўцы, што вельмі цяжка аднавіць страчаны імідж. Як цяпер даказаць спажыўцам, што прадукцыя «Бархіма» добрай якасці? Людзі прывучаны да імпартнага, якое праверана на справе.

Была слушная заўвага наконт асартыменту прадукцыі. Калі выпускаецца звыш сотні назваў розных мыйных сродкаў, то пакупніку цяжка засяродзіцца на нечым канкрэтным — пральным парашку, які быў бы для прадпрыемства знакавым.

Летась на рэкламу сваёй прадукцыі «Бархім» выдзеліў 40 млн рублёў, а за паўгоддзе 2008 года толькі 11,4 мільёна. Але неабходна прызнаць, што тэлерэклама значна ўступае па эфектыўнасці ролікам, якія круцяць вытворцы імпартных мыйных сродкаў. Мала грошай ці не хапае таленту, а можа, таго і другога?

Тым не меней прадукцыя «Бархіма» карыстаецца попытам за мяжой. Летась экспартавалася прадукцыі на 676 тыс. долараў, а сёлета за паўгоддзе — на 340 тысяч. Прадукцыя прадпрыемства пастаўляецца ў Славенію, Латвію, Літву, Казахстан, Расію і Малдову, але айчынны рынак мыйных сродкаў практычна заняты імпартнай прадукцыяй.

А якое ж выйсце, тым больш што не было выяўлена фактаў дыскрымінацыі прадукцыі «Бархіма» ў гандлі? Быццам бы і наракаць няма на каго.

Цяжка выстаяць, калі 80 працэнтаў сыравіны, патрэбнай для выпуску СМС, закупляецца за межамі Беларусі, ды і сыравіна даражэе, напрыклад, сода падскочыла ў цане на 220 працэнтаў! І адсунуць такога гіганта, як «Проктэр энд Гэмбл», напэўна ж, не ўдасца. Тым больш што гэта карпарацыя наладзіла сумесную вытворчасць СМС з расійскімі і ўкраінскімі прадпрыемствамі і пануе на прасторах былога Саюза.

І прадстаўнік Міністэрства гандлю меў рацыю, калі заявіў;

— Праблема актуальная, і адно прадпрыемства яе не вырашыць. Без удзелу вядучых сусветных кампаній з гэтай праблемай у рэспубліцы не справіцца.

Ёсць яшчэ адна рэальная магчымасць падтрымаць «Бархім» — гэта абавязаць бюджэтныя ўстановы выкарыстоўваць прадукцыю толькі гэтага прадпрыемства.

І хоць ужо цяпер большасць бюджэтных арганізацый працуюць з «Бархімам», але яны заключаюць, у асноўным, дагаворы на малыя аб'ёмы. Ці магчымы такі ход у сённяшніх эканамічных умовах?. З дзяржаўнага пункту гледжання зрабіць так можна, а з рынкавага — не.

Адназначна вялікая доля адказнасці ляжыць і на сённяшнім кіраўніцтве прадпрыемства. На «Бархіме» распрацаваны бізнэс-план, але, як было адзначана на нарадзе, ён больш аб намерах, чым аб канкрэтным выкананні пастаўленых задач. А галоўнае, не прадумана стратэгія развіцця прадпрыемства. Вось паставім гэта, заменім тут, а што будзе ў перспектыве — невядома.

А калі такая сітуацыя, то, можа, было б, мэтазгодна паступіць з прадпрыемствам, як з Баранавіцкім мясакамбінатам — ліквідаваць яго як самастойную адзінку?

— Такі шлях самы просты. А мы не павінны забываць, што «Бархім» у нас адзінае прадпрыемства такога профілю. І тут галоўная задача — выпрацаваць канкрэтныя меры па ўмацаванні пазіцый ААТ «Бархім» на ўнутраным рынку і больш актыўным выхадзе прадпрыемства на знешнія рынкі, — заявіў старшыня Дзяржкантролю.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

# ЗАЛАТЫ КАПІТАЛ

**За 8 месяцаў знайшліся пакупнікі на 142 кілаграмовыя і 424 паўкілаграмовыя залатыя мерныя зліткі**

Сведчаннем таго, што беларусы лічаць адным з найбольш выгадных сродкаў захавання сваіх зберажэнняў залатыя мерныя зліткі, з'яўляецца няспынны рост попыту на гэты высакародны метал: толькі за восем сёлетніх месяцаў насельніцтвам набыта ў банках у 3,4 раза больш аб'ём золата, чым за аналагічны леташні перыяд, калі за студзень—жнівень 2007 года было прададзена каля 425 кілаграмаў. Паводле апошніх звестак Нацбанка, у студзені—жніўні было набыта крыху больш за 1,4 тоны залатых мерных зліткаў (47 714 штук). Як і раней, больш за ўсё людзі купляюць 10-грамовыя зліткі, якіх за 8 месяцаў было прададзена 12 887 штук. За імі ідзе продаж 20-грамовых — набыта 10 196 штук. Нягледзячы на вялікія грошы, якія прыходзіцца выкладваць за больш важкія зліткі, сёлета ўжо прададзена 142 зліткі вагой па 1 кілаграму (кошт аднаго такога «бруса» зараз складае 29 978 долараў ЗША) і 424 па 0,5 кілаграма (14 096 долараў).

А вось на зліткі з іншага металу попыт больш сціплы: за студзень—жнівень рэалізавана ўсяго 853 плацінавыя зліткі агульнай вагой 7,56 кілаграма і 154 сярэбраныя, якія заважылі 55,66 кілаграма.

**Ігар ГРЫШЫН.**

# БЕЛАРУСКІЯ ПРЫВАТНЫЯ ГЕРБЫ

## СПЕНСБЕРГЕР

***У чырвоным полі на зялёнай мураве залаты леў з срэбнай шабляй у лапе, направа абернуты.***



Герб роду Высоцкіх.

## ЧЭРВНЯ

***У чырвоным полі дзве палавіны зламанага лука срэбнага з цецівою, складзеныя ў кшталце літары N. На іх — срэбная страла джалам дагары.***



Гербам карысталіся: Косаў, Чарвякоўскі.

**Рубрыку вядзе Уладзімір КРУКОЎСКІ.**

*Сёння, роўна праз год, мы завяршаем публікацыі пад рубрыкай «Беларускія прыватныя гербы», адкрытай па шматлікіх просьбах чытачоў. Рэдакцыя выказвае ўдзячнасць яе вядучаму — вядомаму беларускаму мастаку Уладзіміру Крукоўскаму.*




*Наталіўся Жнівень сонцам, наталіўся*
*За усіх адзінаццаць братоў,*
*Захмяліўся спёкай, ды забыўся —*
*Не пачуў, як Верасень прыйшоў:*
*— Братка, Жнівень, залатой лістотай*
*Нам ад восені не адкупіцца,*
*Напаўняй апошняю спякотай*
*Мой бакал, каб разам наталіцца!*

*Наталіцца сонцам перад ноччу,*
*Цеплынёю перад лютай сцюжай —*
*Чуеш, зазімак здалёку крочыць,*
*Напаўняй бакалы спёкай, дружа!*
*Абняліся, як належыць родным,*
*Заспявала развітання свята...*
*...тую песню ціха і журботна*
*Падхапіла восень каля хаты.*

Пабі рэкорд!

# ПАЛЁТЫ МАБІЛЬНІКАЎ У СНЕ І НАЯВЕ

**Пералётнымі бываюць не толькі птушкі, але і мабільнікі — калі ім прыдаць належнае паскарэнне. Пераканацца ў гэтым 13 верасня змогуць усе ахвотнікі. У Дзень горада ў Мінску пройдзе ўжо традыцыйны чэмпіянат па кіданні мабільных тэлефонаў. Арганізатары мерапрыемства — газета «МабілА» і адміністрацыя Першамайскага раёна сталіцы ў шосты раз збяруць на спаборніцтва кідальнікаў з усёй Беларусі.**

Ёсць, праўда, адно важнае «але»: у чэмпіянаце могуць удзельнічаць толькі аматары, а не прафесійныя спартсмены, якія кідаюць і штурхаюць ядры, молаты, дыскі. Другая ўмова — наяўнасць уласнага «снарада» — арганізатары мабільнікаў для кідання не выдаюць. Усё астатняе — узрост, пол, сацыяльны статус — значэння не маюць.

VI чэмпіянат па кіданні мабільнікаў пройдзе ў трох асноўных намінацыях: самы далёкі кідок (мужчыны і жанчыны выступаюць асобна), самы дакладны кідок і самы эфектны. Для пераможцаў прадугледжаны прызы.

— А прызы добрыя? Ці не пашкадуюць людзі, што разбілі свае тэлефоны? — хваляваліся патэнцыйныя ўдзельнікі.

— Пакуль расказваць пра падрыхтаваныя ўзнагароды рана, але ніхто не пашкадуе аб удзеле — гэта мы гарантуем, — запэўнілі нас арганізатары. Зрэшты, што там сумнявацца, калі на афіцыйнай інтэрнэт-старонцы спаборніцтваў змешчаны празрысты намёк: кідай стары — выйгравай новы. Мабільнік, у сэнсе.

Палёты мабільнікаў можна будзе назіраць у парку Чалюскінцаў, на скрыжаванні Спартыўнай і Бярозавай алей. Пачатак рэгістрацыі — а 12-й гадзіне, пачатак спаборніцтваў — а 13-й. Арганізатары прагназуюць, што ў сёлетніх спаборніцтвах возьме ўдзел звыш 100 чалавек. Для параўнання — летась аматараў шпурнуць свой тэлефон як мага далей было 150.

Чэмпіянат па кіданні мабільных тэлефонаў праводзіцца ў Беларусі з 2003 года. Першым пераможцам у ім быў Андрэй Бараноўскі з вынікам 60,3 м. Другім рэкардсменам стаў Юрый Макараў, які кінуў тэлефон на 76,66 м. А леташні вынік, паказаны Юрыем Тарасюком — 94,41 м — усяго на 56 см саступае сусветнаму рэкорду, які ўстанавіў фін Міка Лампі на чэмпіянаце свету па кіданні мабільнікаў. Дарэчы, арганізатары беларускага чэмпіянату не выключаюць, што ў будучым нашы суайчыннікі таксама трапяць на сусветны турнір — тэарэтычна перашкод для гэтага няма.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**


## Праграма кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў

**Аляксандра ДАБРАВОЛЬСКАГА**
(Свіслацкая выбарчая акруга № 94),
**Валянціны ПАЛЕВІКОВАЙ**
(Купалаўская выбарчая акруга № 95),
**Кацярыны МАЛАСАЕВАЙ**
(Коласаўская выбарчая акруга № 106).







Мы прапаноўваем сваю Праграму, шлях да вольнай і квітнеючай Беларусі.

Поўны тэкст Праграмы чытайце на сайце www.ucpb.org .

Усім людзям трэба жыць, карміць сям'ю, гадаваць дзяцей. Але шалёныя цэны, як саранча, з'ядаюць нашы заробкі. Сацыяльных гарантый пазбавілі пенсіянераў, дзяцей, «чарнобыльцаў», тых, каму яны больш за ўсіх патрэбны.

Беларусь — не бедная краіна. Мы ўмеем і любім працаваць, а значыць, маем права жыць лепш.

Але ці ведаем мы праўду пра тое, куды ідуць народныя грошы? Хто спытаў у людзей, калі прымаліся рашэнні пра ліквідацыю сацыяльных гарантый, пра кабальныя кантракты або пра прыгнёт прадпрымальнікаў?

Чаму так адбываецца?

**Чым менш кантролю над уладай, тым менш яна думае пра людзей.**

Шмат хто баіцца адкрыта выказваць сваё меркаванне. Краіне неабходны сапраўдны парламент, дзе будуць людзі, якія не маўчаць і не дадуць ашукваць народ. Такі парадак у Еўропе, дзе грамадзяне жывуць багата і вольна, таму што кантралююць сваю ўладу.

Кантроль народа над уладай дасць людзям новыя магчымасці жыць лепш.

Усталяваць такі кантроль дапамогуць
АБ'ЯДНАНЫЯ ДЭМАКРАТЫЧНЫЯ СІЛЫ,
якія не баяцца гаварыць праўду.

Службоўцы і прызначаныя дэпутаты абслугоўваюць тых, хто іх прызначыў. А сумленна абраныя дэпутаты ад АБ'ЯДНАНЫХ ДЭМАКРАТЫЧНЫХ СІЛ змогуць абараніць справядлівасць, дамагчыся кантролю над дзеяннямі ўлад.

Кошт учорашняга палітычнага выбару Беларусі — гэты страчаны час для мадэрнізацыі эканомікі, непавага да людзей, міжнародная самаізаляцыя і нізкі аўтарытэт Беларусі ў свеце. Мы прапаноўваем грамадству **новы выбар**.

### Наш выбар у палітыцы і дзяржаўным будаўніцтве

***Дэмакратычная дзяржава, бяспечная краіна, адказны ўрад***

⇨Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы прапаноўваюць новы палітычны шлях. Мы выступаем за Беларусь вольную, дэмакратычную і еўрапейскую. Мы прапаноўваем зрабіць уладу народнай, стварыць рэальнае партнёрства грамадства і дзяржавы. Мы — за жыццё па законе. Мы прапаноўваем пабудаваць дзяржаву, якой ганарацца грамадзяне. Наш выбар для Беларусі ў палітыцы — гэта:

⇨ Правядзенне палітычнай лібералізацыі і паўнавартаснай палітычнай рэформы:
- аднаўленне прынцыпу падзелу ўлад;
- аднаўленне прынцыпу вяршэнства закона, іерархіі прававых актаў;
- вяртанне Канстытуцыі статута вышэйшага заканадаўчага акта дзяржавы, скасаванне актаў заканадаўства, нормы якіх супярэчаць міжнародным прававым стандартам;
- пераход на змешаную, мажарытарна-прапарцыйную сістэму абрання парламента (50% на 50%);
- змяненне выбарчага заканадаўства з мэтай забеспячэння правядзення сумленных, дэмакратычных выбараў па стандартах АБСЕ і Рады Еўропы;
- зняцце ўсіх абмежаванняў у грамадзянскіх правах з грамадзян, якія былі асуджаныя за сваю палітычную дзейнасць, выплата ім бюджэтнага кампенсавання за маральную і матэрыяльную шкоду, зробленую дзяржавай;

⇨ Правядзенне паўнавартаснай судовай рэформы:
- дэпалітызацыя і дэідэалагізацыя судоў;
- прыняцце механізмаў, якія забяспечваюць рэальную фінансавую незалежнасць судоў ад выканаўчай улады;
- развіццё недзяржаўнага арбітража;
- увядзенне крымінальнай адказнасці суддзяў за асуджэнне грамадзян з-за іх палітычных поглядаў і перакананняў.

⇨ Забеспячэнне незалежнасці сродкаў масавай інфармацыі:
- прыняцце закона аб СМІ, які гарантуе дзейнасць грамадскага нацыянальнага тэлеканала, грамадскага радыё, прыватызацыя астатніх тэлеканалаў, радыёстанцый;
- выйсце усіх органаў дзяржаўнага кіравання са складу заснавальнікаў друкаваных СМІ, продаж іх акцый на адкрытым аўкцыёне;
- увядзенне крымінальнай адказнасці дзяржаўных службоўцаў за грубыя парушэнні закона аб СМІ, у тым ліку за адмову ў інфармацыі аб дзейнасці органаў і структур дзяржаўнага кіравання;
- адмена наяўнай прававой нормы супраць СМІ аб абразе гонару і годнасці прэзідэнта, інтарэсаў Рэспублікі Беларусь. Кожны грамадзянін будзе мець аднолькавыя правы па абароне свайго гонару і годнасці ў судзе;

⇨ Забеспячэнне парламенцкага і грамадзянскага кантролю над дзейнасцю дзяржаўных органаў, у тым ліку спецслужбаў і сілавых структур. Прыняцце змяненняў у заканадаўства аб спецслужбах, апісанне механізмаў парламенцкага кантролю, выразнае азначэнне сферы дзяржаўнай таямніцы. Правядзенне адміністрацыйнай рэформы — стварэнне празрыстага, падсправаздачнага, таннага і адказнага ўрада.

### Наш выбар у эканоміцы

***Сумленны рынак, канкурэнтны бізнэс, дынамічны рынак працы***

Наш выбар для Беларусі ў сферы стварэння сумленнага рынку, падтрымкі канкурэнтнага бізнэсу і развіцці дынамічнага рынку працы — гэта прыняцце наступных мер:
- выраўнаванне ўмоў гаспадарання для прадпрыемстваў прыватнай і дзяржаўнай форм уласнасці;
- увядзенне адміністрацыйнай і крымінальнай адказнасці за ўмяшанне ў гаспадарчую дзейнасць суб'ектаў гаспадарання не ўласнікамі прадпрыемстваў;
- выключэнне з усіх нарматыўных прававых актаў палажэнняў, якія прадугледжваюць канфіскацыю маёмасці суб'ектаў гаспадарання;
- стварэнне ўмоў для адкрытай, а не кулуарнай прыватызацыі і ўдзелу ў ёй айчыннага бізнэсу;
- стварэнне ўмоў для ўцягвання зберажэнняў насельніцтва ў легальную сістэму прадукцыйнага капіталу прыватнай формы ўласнасці, у тым ліку для ўдзелу ў куплі акцый самых прыбытковых беларускіх прадпрыемстваў;
- адмена планаў для дзяржаўных органаў па збіранні штрафаў, колькасці пратаколаў і аб'ёму канфіскаваных тавараў;
- паніжэнне агульнай падатковай нагрузкі да 30% ад ВУП, пераход на сістэму з трох падаткаў — без ПДВ, падатку на прыбытак, адваротных падаткаў і шматлікіх збораў;
- пераход на адзіны сацыяльны плацеж замест падаходнага падатку і падаткаў на фонд заработнай платы па стаўцы 15%;
- увядзенне патэнтавай сістэмы для індывідуальных прадпрымальнікаў. Купля патэнта павінна замяняць усе падатковыя плацяжы. Пасля дасягнення ІП гадавога абароту $300 тысяч ІП будуць выплачваць адзін падатак з абарачэння ў памеры 5%;
- спрашчэнне бухгалтарскага ўліку, скарачэнне дакументаабароту, пераход на міжнародныя стандарты бухгалтарскай справаздачнасці;
- рэалізацыя прынцыпу «крэдыту падатковага даверу», вызваленне прадпрыемстваў з такім статутам ад планавых праверак на працягу 7 гадоў;
- адмена ліцэнзавання рознічнага гандлю, скарачэнне пераліку відаў дзейнасці, на якія патрэбны ліцэнзіі, абмежаванне яго толькі тымі выпадкамі, якія могуць мець непасрэдны, прамы ўплыў на жыццё і здароўе чалавека;
- выключэнне з Закона «Аб бюджэце» планавання сум прыбытку на аснове штрафаў і канфіскацый;
- увядзенне забароны на правядзенне рэйдавых падатковых праверак стацыянарных аб'ектаў гандлю і грамадскага харчавання;
- пераход на паўнавартасны заяўны прынцып рэгістрацыі бізнэсу;
- ліквідацыя права органа, які рэгіструе, ліквідаваць камерцыйную арганізацыю.

### Наш выбар у сацыяльнай палітыцы

***Сямейны дабрабыт, сучасныя веды, моцнае здароўе***

Наш выбар для Беларусі для забеспячэння сямейнага дабрабыту, сучасных ведаў і моцнага здароўя — гэта правядзенне наступных мер:
- пераход на сапраўды адрасную сістэму сацыяльнай дапамогі інвалідам, пенсіянерам, маламаёмасным грамадзянам у выглядзе штомесячных грашовых выплат;
- забеспячэнне роўнага доступу да высакаякаснай адукацыі і аховы здароўя для ўсіх грамадзян, незалежна ад матэрыяльнага, сацыяльнага становішча або месцы пражывання;
- захаванне на сённяшнім узроўні ўзросту выхаду на пенсію, якая будзе налічацца ў залежнасці ад стажу і ўмоў працы;
- гарантыі моладзі на атрыманне першага працоўнага месца;
- уключэнне ў выдаткі сем'яў усіх выдаткаў на адукацыю дзяцей, неабкладанне гэтых сум падаткамі;
- усталяванне фіксаванай сумы выплаты: пры нараджэнні аднаго дзіцяці 1000 еўра, другога дзіцяці — 2000 еўра. Пры нараджэнні трэцяга дзіцяці поўная сям'я атрымоўвае жыллёвы крэдыт пад 4% гадавых тэрмінам на 20 гадоў;
- ліквідацыя чэргаў у паліклініках і бальніцах, кампутарызацыя медыцынскіх устаноў;
- якаснае лячэнне, развіццё паўнавартаснай страхавой медыцыны;
- даступнасць банкаўскіх крэдытаў, у першую чаргу, на жыллёвае будаўніцтва;
- абнаўленне і своечасовы рамонт жыллёвага фонду;
- выразныя і стабільныя правілы прыёму ў вышэйшыя і сярэднія прафесійныя навучальныя ўстановы, галоўным крытэрам якіх стане ўзровень ведаў абітурыента;
- роўныя магчымасці для адукацыйных устаноў усіх форм уласнасці, пачынаючы з дашкольных і сканчаючы вышэйшымі;
- 18-гадзінная навучальная нагрузка для настаўнікаў; 700-гадзінная штогадовая навучальная нагрузка для прафесарска-выкладчыцкага складу;
- стыпендыя студэнтам, роўная не менш за два бюджэты пражытковага мінімуму;
- забеспячэнне ўсіх школ і ВНУ доступам да шырокапалоснага інтэрнэту;
- поўная кампутарызацыя школ;
- дэідэалагізацыя адукацыі, пераход на стандарты ЕС у галіне навуковай працы.

### Наш выбар у знешняй палітыцы

*Павага ў свеце, новыя магчымасці*
- аднаўленне міжнароднага аўтарытэту Беларусі, ператварэнне краіны ў надзейнага і прадказальнага партнёра;
- уступ у Раду Еўропы на працягу года пасля правядзення прэзідэнцкіх і парламенцкіх выбараў, падрыхтоўка да ўступу ў Еўрасаюз;
- эфектыўнае выкарыстанне геаграфічнага становішча Беларусі, транзітных магчымасцяў, садзейнічанне супрацоўніцтву паміж Усходам і Захадам;
- захаванне добрых адносінаў з Расіяй, пераклад іх на ўзаемавыгадную рацыянальную аснову, умацаванне супрацоўніцтва з Украінай і ўсімі краінамі-суседзямі.

Мы, кандыдаты ад Аб'яднаных дэмакратычных сілаў, прапаноўваем грамадзянам, бізнэсу і дзяржаве новы выбар. Гэта сумленны выбар. Гэта выбар праўды, даверу да чалавека, падтрымкі нацыянальнага бізнэсу і адказнасці ўлады.

### Наш выбар — гэта:

**грамадскі кантроль за ўладай**
**дэмакратычная дзяржава, бяспечная краіна**
**адказны ўрад**
**сумленны рынак, канкурэнтны бізнэс, дынамічны рынак працы**
**сямейны дабрабыт**
**сучасныя веды**
**моцнае здароўе**

Разам мы зможам гэтага дамагчыся. Для гэтага трэба аднавіць у краіне народаўладдзе. Трэба ўзгадаць пра пачуццё ўласнай годнасці і сваю адказнасць за лёс Беларусі.

Тады ў нашай краіны будзе шанец.

Бо Беларусь заслугоўвае лепшага.

Галоўнае, за што мы выступаем, сказаў 150 гадоў таму Каліноўскі:

**Не народ для ўрада, а ўрад для народа!**

**Падтрымайце кандыдатаў ад Аб'яднаных дэмакратычных сіл.**



## Праграма кандыдата ў дэпутаты па Ясенінскай выбарчай акрузе № 100 г. Мінска СВЯЦКАЙ Валянціны Анатольеўны,

**член Партыі БНФ, адукацыя — вышэйшая, дарадца Рэгіянальнага грамадскага фонду «За Новую Беларусь», 1958 г.н.**



Паважаныя выбаршчыкі Ясенінскай выбарчай акругі № 100!

Асноўнымі пунктамі маёй праграмы з'яўляюцца палажэнні канцэпцыі Партыі БНФ і Аб'яднаных дэмакратычных сілаў Беларусі, якія выступаюць за тое, каб наша краіна была сапраўды палітычна і эканамічна незалежнай краінай і за тое, каб нашы людзі мелі гарантаваныя правы, рэальна карысталіся дэмакратычнымі свабодамі, жылі па-еўрапейску заможна.

Асноўным фактарам развіцця эканомікі ў нашай краіне павінен быць нацыянальны капітал. Але сёння ўлада не дае людзям сумленна працаваць, мноства таленавітых прадпрымальнікаў ці сядзяць па турмах, ці вымушана пакінулі краіну.

Доля малых прадпрыемстваў у беларускім валавым унутраным прадукце (ВУП) складае 8,4%, у Еўразвязе — 40%. Таму мы выступаем за тое, каб дзяржаўнае ўмяшанне ў справы малога і сярэдняга бізнэсу было мінімізавана і каб асновай стабільнага грамадства стаў сярэдні клас — працавітыя, адказныя і заможныя людзі. Трэба разняволіць эканамічную ініцыятыву людзей. Трэба пашырыць базу збору падаткаў праз легалізацыю капіталу і спрашчэнне падатковага заканадаўства.

Мы выступаем за энергетычную незалежнасць Беларусі. Мы за тое, каб яна ўдзельнічала ў альтэрнатыўных праектах паставак энерганосьбітаў разам з нашымі суседзямі — Украінай, Польшчай, балтыйскімі краінамі, што запатрабуе ад Беларусі дэмакратычных рэформаў.

Школу Беларусі трасе ад безупынных і неабгрунтаваных рэформаў. Сапраўдныя мэты цяперашняй рэформы — аддаліць адукацыйную сістэму краіны ад еўрапейскіх стандартаў, а галоўнае — скараціць колькасць настаўніцкіх ставак на 10 тыс., «зэканоміць» такім чынам на сацыяльнай сферы. Мы — за спыненне неабгрунтаванай, непадрыхтаванай, шкоднай для школы рэформы! Мы — за вяртанне Беларусі да сусветнага досведу сярэдняй і вышэйшай школы!

У краінах Еўразвязу на медыцыну выдаткоўваецца 9% ВУП, у ЗША — 15%, а ў Беларусі — 4,2%. Разам з тым на МУС і КДБ — удвая больш. Дзе браць грошы на паляпшэнне медычнага абслугоўвання насельніцтва, для нас відавочна. Акрамя таго, трэба ісці за цывілізаваным светам і паступова ўкараняць страхавую медыцыну.

Улада заняволіла і зняважыла ўсе групы насельніцтва: дзяржаўных рабочых і службоўцаў так званай кантрактнай сістэмай, прадпрымальнікаў — непрадказальнымі правіламі і невыноснымі падаткамі, пенсіянераў, інвалідаў, студэнтаў і дзяцей — скасаваннем сацыяльных гарантый.

Мы выступаем за тое, каб годнасць і магчымасці кожнага чалавека былі абаронены Законам!

Расійскі капітал у змове з уладамі захоплівае зямлю і нерухомасць у беларускіх гарадах, стаіць за карупцыйнымі праектамі ўшчыльнага будаўніцтва ў мікрараёнах, высяленне жыхароў з гістарычных цэнтраў гарадоў, разбурэння помнікаў архітэктуры.

Мы за жорсткае выкананне зямельнага і экалагічнага заканадаўства і закона аб ахове помнікаў!

Злачыннасць, амаралізм, бездухоўнасць, алкагалізм точаць нацыю з сярэдзіны. Трэба спыніць бясплённую (і нятанную для бюджэту) рэанімацыю мёртвых савецкіх шаблонаў — дзяржаўнай ідэалогіі, фальшывых грамадскіх арганізацый. Наш народ мае правераныя вякамі нацыянальныя каштоўнасці — традыцыі, мову, культуру, гістарычную памяць. Іх адраджэнне стане запрукай перспектывы беларусаў як годнага еўрапейскага народа.

Беларусь — не бедная краіна. Мы, беларусы, умеем і любім працаваць, а значыць, маем права жыць лепей. Але ці ведаем мы праўду пра тое, куды ідуць народныя грошы? Хто запытаўся людзей, калі прымаліся рашэнні пра ліквідацыю льготаў, пра кабальныя кантракты ці разарэнне прадпрымальнікаў?

Чаму так адбываецца?

Таму, што чым менш кантролю над уладай, тым менш яна думае пра людзей.

Многія баяцца адкрыта выказваць сваю думку.

Чыноўнікі і прызначаныя ўладай дэпутаты абслугоўваюць тых, хто іх прызначыў.

Мы ўпэўнены, што сумленна абраныя дэпутаты ад Аб'яднаных дэмакратычных сілаў здолеюць абараніць справядлівасць, дамагчыся кантролю над дзеяннямі ўладаў.

Кантроль над уладай дазволіць:
- стварыць лепшыя ўмовы для эканомікі, спыніць рост цэнаў і захаваць сацыяльныя гарантыі;
- наладзіць партнёрства з Еўрапейскім Звязам і адкрыць для краіны новыя магчымасці, забяспечыць прыход у краіну заходніх інвестыцый;
- вызваліць прадпрымальнікаў ад самавольства ўладаў;
- гарантаваць новыя працоўныя месцы, якасную адукацыю і ахову здароўя;
- гарантаваць людзям правы і свабоды.

Мы любім Беларусь!

Мы заўсёды адстойвалі беларускія нацыянальныя інтарэсы, палітычную і эканамічную незалежнасць нашай краіны.

Мы за тое, каб Беларусь стала свабоднай і заможнай краінай!

Мы ведаем, што зрабіць, каб цягам некалькіх гадоў у асноўным пераадолець памылкі і злыя намеры цяперашняга кіраўніцтва. Але змены да лепшага магчымыя толькі тады, калі народ свабодны, калі ён выбірае ўладу падчас свабодных, справядлівых, празрыстых выбараў.

Не народ для ўлады, а ўлада для народа!

